ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьніж тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. ад аўтку.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

30 красавіка—1 мая 1930 г.
№ 101 (3609)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна наперад да новых перамог!

Будаўніцтва сацыялізму ў СССР—база міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі

Няхай жыве Камуністычны Інтэрнацыянал!

АДОЗВА ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КП(б)Б

да ўсіх рабочых, работніц і працоўнага сялянства БССР

ТАВАРЫШЫ

1-га мая гэтага году пралетарыят і працоўныя масы ўсіх краін праводзяць у абстаноўцы, калі за мінулы год, разам з моцным разьвіцьцём будаўніцтва сацыялізму ў СССР, асабліва рэзка выявілася гніцьцё і развал капіталістычнай сыстэмы.

Капіталістычны сьвет ахоплен усё ўзрастаючымі супярэчнасьцямі. Ва ўмовах вострага прамысловага і аграрнага крызісу, ахапляючага з кожным днём усё новыя і новыя краіны, і катастрафічнага росту беспрацоўя, абвастраецца барацьба за рынкі, расьце бязьлітасная варожасьць паміж капіталістычнымі краінамі. Самым глыбокім крызісам ахоплены Паўночна - Амэрыканскія Злучаныя Штаты, якія ўсімі сацыял-здраднікамі сьвету ставіліся ў прыклад капіталістычнага росквіту. Разам з буйнымі капіталістычнымі краінамі маецца рэзкае абвастрэньне крызісу ў калёніях і ў поў-аграрных краінах. Усё гэта поўнасьцю сьцьвярджае ацэнку, дадзеную Камінтэрнам аб пачаўшымся разьвале капіталістычнай стабілізацыі, аб насьпяваньні сусьветнага эканамічнага крызісу.

Крызіс пястрымана штурхае імпэрыялізм на новыя войны. Бясконцым скліканьнем усякіх канфэрэнцый, шуміхай аб разбраеньні, клятвамі аб міры, імпэрыялісты пры актыўнейшым падтрыманьні сацыял - фашыстых, імкнуцца ўтаіць ад працоўных мас ліхаманкавую падрыхтоўку да новай вайны. Разам з ростам варожасьці ва ўласным дягеры імпэрыялістыя з кожным днём усё больш узмацняюць адзіны фронт супроць СССР. Падзеі на Кітайска-Усходняй чыгунцы, шалёная кампанія ў Францыі, Англіі і іншых краінах за зрыў дыпляматычных зносін, падрыхтоўка „крыжовага паходу“, — усё гэта ярка выкрывае ваенныя падрыхтоўкі буржуазіі, якая прабуе сарваць насьпяховую работу па выкананьні пяцігадовага пляну ў СССР, у адзінай краіне сьвету, будуючай сацыялізм.

Разам з абвастрэньнем ваеннай небясьпекі сусьветны эканамічны крызіс выклікаў значныя нагоршаньня становішча рабочае клясы і нябачаны рост беспрацоўя, якое ў капіталістычных краінах і калёніях дасягло лічбы 20 мільёнаў. Буржуазія імкнецца перакласьці ўвесь цяжар эканамічнага крызісу на плечы рабочых. Рабочая кляса ва ўпартых і жорсткіх стачачных бойках, якія хутка і нямінуча ў сучасных абставінах перарасталі ў палітычныя бойкі, каторыя ўсюды суправаждаліся крывавымі сутычкамі, паказала сваю ращучую гатоўнасьць даць адпор буржуазіі яшчэ большым згуртаваньнем сваіх радоў і мабілізацыяй усіх сіл для адказу на ўдар — ударам, для пераходу ад абароны да наступу. Асабліваго размаху дасягла рэвалюцыйная барацьба пралетарскіх і сялянскіх мас у калёніях.

Ва ўмовах крызісу, пачатку развалу капіталістычнай стабілізацыі і нарастаньня ўсюды пад'ёму рэвалюцыйнага руху з асабліваю нагляднасьцю і рэзкасьцю выказваецца здрадніцкая роля сацыял-фашыстых. Толькі з іх дапамогаю і пры іх актыўным удзеле буржуазія праводзіць перагрупаваньне сваіх сіл для новага націску на рабочых, узмацняе фашысцкі тэрор супроць рабочае клясы, уздымае самую пікчэмную кампанію хлусьні супроць Савецкага Саюзу.

Адзінай партыяй барацьбы за бліжэйшыя і канчатковыя мэты пралетарыяту, адзіным кіраўніком змагаючыхся беспрацоўных мас, адзіным правадыром насьпяваючых баёў прыгнечаных народаў у калёніях, адзіна насьлядоўным барацьбітом супроць вайны — зьяўляюцца камуністычныя партыі. Змагаючыся ў сваіх радох супроць правай небясьпекі, як галоўнай, і супроць «левых» ухілістых, папаўняючы свае рады ўсё большымі і большымі пралетарскімі сіламі, праводзячы выразную клясавую лінію, ажыцьцяўляючы адзіны фронт зьнізу, кіруючы стачачным рухам і рухам беспрацоўных, узглаўляючы рэвалюцыйную барацьбу прыгнечаных мас калёній, камуністычныя партыі вядуць усю рабочую клясу і ўсіх працоўных да перамогі над сусьветным імпэрыялізмам, да перамогі пралетарскай рэвалюцыі, якая забясьпечвае будаўніцтва сацыялізму ва ўсім сьвеце.

Вялізарныя дасягненьні, якія мае СССР на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, рост матар'яльнага добрабыту працоўных, значнае зьмяншэньне беспрацоўя найбольш выразна выяўляюць кантраст паміж Савецкім Саюзам і капіталістычным сьветам, які задыхаецца ў ціскох крызісу і беспрацоўя. Лёзунг — выканаць пяцігодку ў чатыры гады з усёй рашучасьцю ажыцьцяўляецца рабочай клясай і ўсімі працоўнымі Савецкага Саюзу. Бліскучыя посьпехі пяцігодкі, паскораныя тэмпы разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці, рост калгаснага руху па ўсім Саюзе, а ў важнейшых зернявых раёнах ажыцьцяўленьне суцэльнай калектывізацыі, і правядзеньне на падставе гэтага палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, узмацненьне абароназдольнасьці краіны, — гэткія асноўныя дасягненьні Савецкага Саюзу і БССР за мінулы год.

Сацыялістычнае наступленьне на ўсіх франтох, рашучае выкарчоўваньне карэньняў капіталізму выклікаюць абвастрэньне клясавай барацьбы ў нашай краіне. Кулакі і нэпманы, пры падтрыманьні раду шкодніцкіх арганізацый, мабілізуюць усе свае сілы, каб перашкаджаць пасьпяховаму ходу сацыялістычнага будаўніцтва ў краіне саветаў. Не дарма буржуазія ўсіх краін падняла шалёнае выцьцё супроць Савецкага Саюзу, калі мы практычна прыступілі да раскулачваньня ў раёнах суцэльнае калектывізацыі, бо пачатак ліквідацыі кулацтва, як клясы, вырывае ў сусьветнага імпэрыялізму контр - рэвалюцыйную апору ўнутры СССР.

Эканамічны і культурны рост БССР за апошнія гады зьяўляецца найбольшым паказчыкам нашых дасягненьняў. Дзякуючы настойліваму правядзеньню ў жыцьцё ленінскай лініі ў нацыянальным пытаньні, Савецкая Беларусь, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, і пры вялізарнай дапамозе СССР, з краіны аграрнай, адсталай сапраўды вырастае ў краіну індустрыяльна - аграрную, дзе растуць новыя моцныя электрастанцыі, буйныя фабрыкі, заводы, саўгасы, калгасы і буйнейшыя культурныя установы.

Толькі ў выніку няўхільнага правядзеньня ў жыцьцё генэральнай лініі партыі дасягнуты такія вялікія посьпехі на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. За мінулы пэрыяд партыя правяла рашучую барацьбу з усякімі ўхіламі ад правільнай ленінскай лініі, з правым ухілам і прымірэнцтвам, як галоўнейшай небясьпекай на даным этапе, і з усякімі рэшткамі трацкізму і «левымі» загібамі, і тым самым забясьпечыла магчымасьць больш рашучага і настойлівага перамагаць усе цяжкасьці, якія сустракаюцца на шляху будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне.

Другі год пяцігодкі сьведчыць аб новых посьпехах у прамысловасьці і сельскай гаспадарцы. За першае паўгодзьдзе гэтага году, у параўнаньні з тым-жа пэрыядам мінулага году, наша буйная дзяржаўная прамысловасьць ужо дала значнае павялічэньне прадукцыі, аднак вызначаная лічба росту на пляне бягучага году яшчэ не дасягнута. І асабліва рэзка адстала прамысловасьць у выкананьні якасных паказчыкаў: зьніжэньня сабекошту і паляпшаньня якасьці прадукцыі. Маем адставаньне і ў выкананьні прамфінпляну, ня гледзячы на тое, што актыўнасьць і ўпэўненасьць рабочае клясы ў посьпехах сацыялістычнага будаўніцтва значна ўзрасьлі.

Прычына ў тым, што не выкарыстаны яшчэ ў поўнай меры вялізарны ўздым рабочае клясы вакол вырашэньня асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва. Прафсаюзы яшчэ дагэтуль не перабудавалі сваёй работы паводле мэтаду «тварам да вытворчасьці». Цалкам яшчэ не ажыцьцёўлена дырэктыва партыі аб адзінаначальні, аб правядзеньні ў жыцьцё усіх задач па сацыялістычнай рацыяналізацыі.

Самакрытыка ня ўсюды яшчэ стала актыўна дзейнічаючым мэтадам барацьбы з усімі недахопамі нашага будаўніцтва. Недастаткова рашуча праводзіцца барацьба з канкрэтнымі носьбітамі бюракратычных скажэньняў у нашай рабоце.

Асноўная задача, якая стаіць у дзень 1-га мая перад партыйнымі, прафэсыянальнымі і гаспадарчымі арганізацыямі — дабіцца поўнага выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну другога году пяцігодкі. Яшчэ шырэй разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, яшчэ больш узмацніць барацьбу з прагуламі, прастоямі і бракам, асабліва рашуча налегчы на паляпшаньне якасьці прадукцыі, і поўнае выкананьне ўсіх мерапрыемстваў па зьніжэньні сабекошту прадукцыі.

Вялізарныя посьпехі ў справе калектывізацыі сельскае гаспадаркі дасягнуты дзякуючы правільнаму правядзеньню ў жыцьцё генэральнай лініі партыі ў пытаньнях сацыялістычнае перабудовы сельскае гаспадаркі. Адначасова ў рабоце па калектывізацыі партыя цалкам улічвае і рашуча па-бальшавіцку выпраўляе тыя памылкі, скажэньні партыйнай лініі, якія мелі месца і маюць месца ў практычнай рабоце.

Узмацняючы і пашыраючы калгасны рух, узмацняючы ўнутры гаспадарчае становішча кожнага калгасу і саўгасу, рашуча выпраўляючы антысярэдняцкія перагібы, дапушчаныя ў практычнай рабоце, праводзячы і ў далейшым рашучае наступленьне на капіталістычныя элемэнты, арганізуючы і згуртоўваючы батрацкія і бядняцка - серадняцкія масы сялянства, узмацняючы саюз рабочае клясы і беднаты з серадняком, аказваючы ўсямернае падтрыманьне і дапамогу сацыялістычнаму сэктару, — партыя забясьпечвае новыя посьпехі ў галіне сацыялістычнае перабудовы сельскае гаспадаркі.

Цэнтральная задача сёнешняга дня зьяўляецца насьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы. Мабілізацыяй усіх сіл батрацка - бядняцка - серадняцкай масы сялянства, як аб'яднанай у калгасы, гэтак і ўдучых яшчэ індывідуальную гаспадарку, пад актыўным кіраўніцтвам і пры ўдзеле рабочых арганізацый, неабходна дабіцца поўнага выкананьня і перавыкананьня вызначаных плянаў веснавой сяўбы. Адначасова калгасы і саўгасы павінны аказаць усямерную дапамогу і служыць прыкладам для індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у справе пасьпяховага правядзеньня яравога пасеву, пашырэньня пасеўнай плошчы і правядзеньня ўсіх неабходных мер для ўздыму жывёлагадоўлі.

Побач з вялізарнейшымі дасягненьнямі ў культурным будаўніцтве мы маем яшчэ на гэтым вучастку рад сур'ёзных недахопаў.

Пяцігодка культурнага будаўніцтва яшчэ значна адстае ад пяцігодкі ўсяе нашае народнае гаспадаркі. Выкананьне аграмадных задач у галіне сацыялістычнага будаўніцтва, правядзеньне настойлівай работы па падрыхтоўцы неабходных кадраў народнае гаспадаркі, выкананьне ўсіх намечаных плянаў па сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі, — усё гэта патрабуе ад нас значна большай мабілізацыі сваіх сіл на фронце культурнай рэвалюцыі.

Таварышы, каб быць на вышыні паставленых перад намі гісторыяй аграмадных задач, мы павінны падняць на актыўную работу па сацыялістычным будаўніцтве ўсё новыя і новыя пласты працоўных мас.

Нашае першамайскае пралетарскае сьвята няхай яшчэ больш згуртуе працоўных усяго сьвету ў барацьбе за сусьветны Кастрычнік.

Першамайскае сьвята няхай яшчэ больш згуртуе працоўных вакол сталёвых радоў Камуністычнай партыі, якая вядзе неаслабную барацьбу супроць усялякіх хістаньняў і адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі.

Мабілізуем усе свае сілы на правядзеньне выразнай ленінскай лініі ў нацыянальным пытаньні, не паслабляючы бязьлітаснай барацьбы супроць нацыянал - апартунізму і беларускага нацыянал - дэмакратызму, супроць шавінізму ўсіх колераў.

Няхай мацней выбухне рэвалюцыйная бура!

Няхай жыве сьвята першага мая — баявы агляд рэвалюцыйных сіл сусьветнага пралетарыяту!

Нашае гарачае першамайскае прывітаньне пралетарам усіх краёў.

Няхай жывуць працоўныя Заходняй Беларусі і Польшчы, якія пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі вядуць гэраічную барацьбу за вызваленьне ад капіталістычнага ўціску!

Няхай жыве СССР — аплот міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі!

Няхай жывуць сталёвыя рады Усесаюзнай Камуністычнай партыі бальшавікоў і яе баявы штаб — Ленінскі ЦК УсеКП(б)!

Няхай жыве Камуністычны Інтэрнацыянал!



На перадавыя лініі клясавае барацьбы

Пралетарам ўсіх краёў і прыгнечаным народам усяго сьвету!

Таварышы! Насьпяваючы сусьветны эканамічны крызіс усё больш выяўляе супярэчнасьці, якія разьвядаюць капіталістычны сьвет. Рушацца хвасьлівыя цьверджаньні буржуазіі і яе сацыял-дэмакратычных лёкаяў аб невычарпальных сілах капіталізму, аб яго арганізаванасьці і творчай магутнасьці. Буржуазія ўжо бясьсільна справіцца з разьвалам сусьветнае капіталістычнае гаспадаркі, які ўжо распачаўся. Але яна яшчэ ў стане прызначаць на гопад і сьмерць мільёны і дзесяткі мільёнаў рабочых і сялян. Ва ўсіх частках сьвету, мэтраполіях і калёніях, разьлікі буржуазіі пабудаваны на тым, каб выбрацца з крызісу за кошт працоўных. Шалёна ўзрастаюць бярышы фінансавых магнатаў, якія нажываюцца на крызісе. Рабочыя-ж сотнямі тысяч выкідваюцца з фабрык і заводаў. Дваццаць мільёнаў беспрацоўных, ахвяры крызісу і капіталістычнай рацыяналізацыі блукаюць па вуліцах гарадоў. У той-жа час на вёсках фінансавы капітал зганяе з зямлі вялізныя масы сялян, якія разбураюцца аграрным крызісам і кідае іх у армію беспрацоўных і паўпераў.

Усё больш лютуе фашысцкі тэрор. Буржуазныя, у тым ліку і сацыял-дэмакратычныя ўрады пазьвярынаму расправяляюцца з рабочымі і сялянамі. Яны забіваюць па суду і бяз суду. Яны страляюць у бастуючых рабочых, у рады дэманстрантаў, у пратэстуючых сялян, у калёніяльных рабоў. Яны ўсюды імкнуцца разграміць у першую чаргу рэвалюцыйны авангард рабочае клясы — камуністычныя партыі.

Рабочыя, хіба-ж вы не пазнаяце правадыроў II і Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу сярод катаў, якія накіроўваюць зброю супроць пралетарыяту ў Бэрліне і Лёндане, у Нью-Ёрку, у Паўдзённай Амэрыцы, у Кітаі, Індыі, Інда-Кітаі, Афрыцы?

Шалёна ўзрастаюць узброеныя спаборніцтвы імпэрыялістычных дзяржаў. Пры агульным скарачэньні вытворчасьці ліхаманкава працуе ва ўсіх капіталістычных краёх ваенная прамысловасьць. Брудны клубок заведама ілжывых нібы мірных згод выкрывае падрыхтоўку і расстаноўку сіл для новых імпэрыялістычных войнаў. Няма тэй часьці сьвету, дзе змаганьне паміж Злучанымі Штатамі і Англіяй за сусьветнае панаваньне, якое зьяўляецца восьсю міжнародных супярэчнасьцяй у капіталістычным сьвеце, не дасягнула-б пад уплывам эканамічнага крызісу нябывалага яшчэ напружаньня. Няма такога пункту на Ціхім акіяне, дзе ня стыкаліся-б самым няпрымірымым чынам інтарэсы і апэтыты Вашынгтону, Лёндану і Токіё. Лёнданская морская згода зьяўляецца новым інструментам вайны, і кожны з удзельнікаў сьпяшаецца з напружаньнем усіх сіл скарыстаць яе ў сваіх ваенных мэтах. Плян Юнга ў абстаноўцы змаганьня за рынкі збыту, якое робіцца ўсё больш і больш жорсткім, фарсуе ваенныя сутычкі паміж імпэрыялістычнымі групоўкамі. Небясьпека ваеннай разьвязкі франка-італьянскага спаборніцтва настолькі ўзрасла на Міжземным моры, што імпэрыялістым і правыдыром II Інтэрнацыяналу не ўдаецца нават захаваць гэту небясьпеку.

Такім чынам, чалавецтва ўсё шпарчэй ацягваецца ў вір махінацый для арганізацыі новых імпэрыялістычных войнаў. Шарлятаны II Інтэрнацыяналу імкнуцца ўсыпіць пільнасьць рабочых сваёй пацыфісцкай балбатнёй. Фашысцкія дэмагогі прабуюць прывабіць найбольш адсталыя пласты пэрспэктывай «выгоднай» вайны.

Працоўныя, ганеце прэч і тых І другіх. Ці ня тыя-ж словы чулі вы І вашы бацькі напярэдадні імпэрыялістычнай вайны 1914 году, з яе дзесяткамі мільёнаў чалавечых ахвяр?

Буржуазія лічыць новыя імпэрыялістычныя войны адзіным выхадам з цяперашняга крызісу сусьветнага капіталізму. Але актыўнасьць міжнароднага пралетарыяту і ўзрастаючая магутнасьць СССР перашкаджае імпэрыялістым ажыцьцявіць пляны перадзелу сьвету. Разьлікі сусьветнай буржуазіі на ліквідацыю савецкай улады палітыкай эканамічнай блёкады і шкодніцтва, палітыкай пагрозы і гвалту наглядна абвергнуты посьпехамі сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе. Дзякуючы цьвёрдай вытрыманасьці і баявой непахіснасьці працоўных СССР, дзякуючы іх рашучай і пасьлядоўнай палітыцы міру і разам з тым гатоўнасьці пры першай неабходнасьці даць магутны адпор гвалтаўніком і правакатарам, Савецкаму Саюзу ўдалося адбіць напад імпэрыялістых і няўхільных працягваць мірнае сацыялістычнае будаўніцтва. Ніколі міжнародны пралетарыят ня меў такога жывога доваду, што ён ня толькі пасьлеў для зьвяржэньня капіталізму, але і для пабудаваньня сацыялістычнага грамадзтва, як урачыстасьць пяцігадовага пляну народнае гаспадаркі СССР, які з посьпехам ажыцьцяўляецца. Забітыя І прыдушаныя сялянскія масы капіталістычных дзяржаў і даведзеныя да роспачы калёніяльныя рабы бачаць, што ў краі пралетарскай дыктатуры мільёны дробных сялянскіх гаспадарак далучаюцца, на аснове быстрага ўздыму іх матар'яльнага і культурнага ўзроўню праз калгаснае будаўніцтва да грандыёзнага сацыялістычнага перабудаваньня.

Іменна таму ўсё больш - гучна, усё больш выклікаюча бразгаюць зброяй супроць Савецкага Саюзу арганізатары імпэрыялістычных войнаў. Іменна таму пануючыя імпэрыялістычныя зграі назначаюць у Польшчы, Румыніі і ў іншых падуладных ім краёх такія ўрады, якія гатовы безагаворачна пастаўляць гарматнае мяса для ваеннага паходу на СССР. Іменна таму сацыял-дэмакратычныя паклёпнікі і правакатары, якіх б'юць у твар вялікія посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе, замоўчваючы перад рабочымі ўзмацненьне ваенных падрыхтаваньняў супроць СССР, за іх сьпіной актыўна ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы гэтай вайны.

Усе рабочыя, усе працоўныя, стойце на варце першай рэспублікі працы, на варце Савецкага Саюзу, вашай сацыялістычнай бацькаўшчыны!

Буржуазія і яе сацыял-дэмакратычныя найміты жорстка напалі ў мінулым годзе на рэвалюцыйных дэманстрантаў 1 мая. Буржуазія разьлічвала першамайскім крывапусканьнем затрымаць рэвалюцыйны ўздым рабочага руху. Яна памылілася ў разьліках. На разгул тэрору рабочыя адказваюць пашырэньнем фронту пралетарскага змаганьня, на катаржныя законы супроць забастовак—абвастраньнем забастовачнага змаганьня; на штрэйкбрэхэрства рэфармісцкіх прафбюракратаў—арганізацыяй забастовачных камітэтаў, выбраньнем чырвоных фабзаўкомаў, узмацненьнем рэвалюцыйнай прафпрацы, будаўніцтвам чырвоных прафсаюзаў.

Забастовачны рух, набываючы ўсё больш рашучы характар, становіцца вялікай школай рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту супроць буржуазіі і дзяржавы.

Дэманстранты 1 жніўня 1929 году ў міжнародны дзень барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны і дэманстранты 6 сакавіка 1930 г. у міжнародны дзень барацьбы з беспрацоўем адгукнуліся на заклік камуністычнай партыі. Перад тварам шырокіх мас працоўных яны выкрылі ваенную змову фінансавай алігархіі і сацыял-дэмакратычных правадыроў. Буржуазія і яе сацыял-фашысцкія міністры хацелі раскалоць рабочую клясу, нацкаваўшы беспрацоўных на працуючых. Сакавіцкая дэманстрацыя расстроіла гэты злачынны плян. Дэманстранты Дэтройту і Нью-Ёрку выклікалі трывогу ў чванлівай буржуазіі Злучаных Штатаў і яе прыказчыка Гувэра. Дэманстранты Бэрліну і Лёндану сарвалі маску з сацыял - дэмакратычных урадаў Макданальда і Мюльлера, у той момант, калі тыя дагаворваліся са сваёй буржуазіяй аб новым абрабаваньні працуючых і беспрацоўных. Ва ўсіх часьцях сьвету найбольш актыўная частка рабочых мас гэраічна адбівалася ў часе дэманстрацый ад жандарскіх і паліцэйскіх банд.

Ужо падыходзяць рэвалюцыйныя рэзэрвы. Пралетарыят Кітаю, апраўшыўшыся пасьля ўдараў контр-рэвалюцыі, вырасшы і загартаваўшы свае сілы ў змаганьні з сусьветным імпэрыялізмам, паўстае на новыя рэвалюцыйныя баі. Шматлікія атрады кітайскіх рэвалюцыйных сялян ва ўзброеным змаганьні ўмацоўваюць у радзе раёнаў чырвоны сьцяг саветаў. Малады пралетарыят Індыі, накапляючы баявы вопыт у буйных забастоўках і дэманстрацыях і выкрываючы здрадніцкія манэўры індыйскіх буржуазных партый, рыхтуецца да сваёй сусьветна-гістарычнай місіі—павесьці за сабой у рэвалюцыйнае змаганьне сотні мільёнаў прыгнечаных сялян супроць разбойніцкага ангельскага імпэрыялізму. Усё гучней чуцён гром клясавых баёў у Паўднёвай Амэрыцы. Новыя папаўненьні з радоў паўстаючых супроць імпэрыялістычнага ўціску нэграў Афрыкі ўліваюцца ў рэвалюцыйныя рэзэрвы.

Пралетары ўсіх краёў! Камуністычны Інтэрнацыянал заклікае вас адзначыць дзень 1 мая—дзень міжнароднай пралетарскай салідарнасьці—масавымі рэвалюцыйнымі выступленьнямі, масавымі забастоўкамі ці дэманстрацыямі ў залежнасьці ад абстаноўкі. Ён заклікае вас пад свае сьцягі для рашучага змаганьня супроць разгорнутага наступленьня капіталу, супроць жахліва ўзрастаючай эксплёатацыі, супроць пакутнага беспрацоўя, супроць вазьвярэлага фашызму, супроць надыходзячых новых імпэрыялістычных войнаў. Камуністычны Інтэрнацыянал заклікае вас узмацніць сваю баявую гатоўнасьць і цьвёрда стаяць на абароне Савецкага Саюзу, супроць якога ліхаманкава рыхтуюць свой паход імпэрыялістычныя зграі і іх паслугачы з лягеру сацыял-дэмакратаў і сацыял-пацыфістых.

Рабочыя! Скарыстайце абстаноўку эканамічнага крызісу, усімі сіламі падтрымлівайце мільёны беспрацоўных і ўмацоўвайце тым самым армію пралетарыяту. Арганізуйце свае сілы для зьвяржэньня капіталізму для сацыялістычнай рэвалюцыі. Згуртоўвайцеся вакол камуністычных партый!

Бедната і ўся працоўная маса вёскі! Толькі ў баявым саюзе з рэвалюцыйным пралетарыятам вы скінеце ўзрастаючы ўціск капіталістых і памешчыкаў. Пад кіраўніцтвам пралетарыяту ўступайце на шлях пераможнага змаганьня за сацыялізм. Вучэцеся ў байцоў Кастрычніцкай рэвалюцыі, вучэцеся ў калгаснікаў СССР!

Прыгнечаныя народы калёній! Яднайцеся ў рэвалюцыйным змаганьні за зьвяржэньне ўлады імпэрыялістычных разбойнікаў і іх фэадальна-капіталістычных саюзьнікаў у вашым краі. Шчыльней згуртоўвайцеся з рэвалюцыйнымі рабочымі капіталістычных краёў.

Усе працоўныя і прыгнечаныя! Памятайце ахвяры і жахі імпэрыялістычнай вайны. Імпэрыялістычныя войны зноў падкрадваюцца да вас. Прабуджайце рэвалюцыйную сьвядомасьць салдат і матросаў. Рыхтуйцеся абярнуць імпэрыялістычную вайну ў грамадзянскую вайну ўсіх працоўных, супроць сваёй буржуазіі. Арганізуйце свае сілы для абароны СССР.

Салдаты і матросы! Прэч палачную дысцыпліну і казарменнае рабства. Братайцеся з рабочымі. Памятайце цьвёрда: ваш абавязак павярнуць у часе вайны гарматы і кулямёты супроць эксплёататараў!

Работніцы! Вашы перадавыя атрады мужна і стойка трымаюць рэвалюцыйны фронт. Змагайцеся супроць касьцістай рукі голаду, якая душыць вашых дзяцей. Клічце братоў і мужэй на рэвалюцыйнае змаганьне!

Пралетарская моладзь! Капіталістычная пралягнаналізацыя паглынае вашы сьвежыя сілы. Вас у першую чаргу імпэрыялістыя зьбіраюцца кінуць на вайну.

На перадавыя лініі рэвалюцыйнага клясавага змаганьня!

Няхай жыве рэвалюцыйнае 1-е мая!

Няхай жыве пралетарскі адзіны фронт!

Прэч імпэрыялістычную рацыяналізацыю! Няхай жыве 7-мігадзінны рабочы дзень!

Няхай жыве СССР—бацькаўшчына працоўных ўсіх краёў!

Прэч імпэрыялістычны ўціск! Няхай жыве поўнае вызваленьне калёній!

Прэч імпэрыялістычныя войны! Прэч капіталізм!

Няхай жыве сусьветная сацыялістычная рэвалюцыя!

ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ.

НАЧНОЕ РАДЫЁ

ХТО-Ж ВІНОЎНІК ЗАМАХУ

«ГАЗЭТА ПОЛЬСКА» АДВОДЗІЦЬ ПАДАЗРЭНЬНЕ АБ МАГЧЫМАСЬЦІ ЗАМАХУ З БОКУ ПОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ І АБАРАНЯЕ РАСІЙСКІХ БЕЛАГВАРДЗЕЙЦАЎ

НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ЗАГАД «УМЕРЫЦЬ ПЫЛ», БУЛЬВАРНЫ ДРУК ПРАЦЯГВАЕ АНТЫСАВЕЦКУЮ ТРАЎЛЮ

ВАРШАВА, 29. Сёньня ў польскім друку наглядаецца пэўны пералом. Як відаць, адказныя палітычныя колы пачалі аддаваць сабе справаздачу ў тым, што частка пілсудчыкаў залішне захапілася разгортваньнем антысавецкай кампаніі. Лінію друку выпраўляе сёньня у перадавіцы афіцыяльны орган пілсудчыкаў «Газэта Польска», якая піша: «Паведамленьне аб замаху на савецкае пасольства ў Варшаве, уся польская грамадзкасьць спаткала з вялікім абурэньнем, бо яно можа выклікаць толькі абвастрэньне польска-савецкіх адносін. Газэта заяўляе, што яна выключае ўсякія думкі аб тым, што замах арганізаваны якой нібудзь польскай арганізацыяй, як-бы яна нябыла варожа настроена да камунізму, бо падобныя спробы былі-б на шкоду інтарэсам польскай дзяржавы». Разам з гэтым газэта заяўляе, што яна ня хоча выклікаць падазрэньня на расійскія бела-эміграцкія колы, з якіх вышлі Кавэрда, Вайцахоўскі... якія дзейнічалі як ворагі польскай дзяржавы. Газэта лічыць, што ворагі, якія рыхтавалі замах, павінны быць знойдзены і справа павінна быць выяснена. «Энэргія сьледчай улады,—піша газэта, павінна пакласьці канец усякім дурным талкаваньням, якія узьнікаюць дзякуючы усялякім дагадкам. Заява аднэй з газэт, што трэба лічыцца з магчымасьцю інсцэніроўкі замаху самім савецкім пасольствам, ці асобамі блізкімі да яго, павінны быць самы рашучым чынам асуджаны, тым больш, што тэза аб інсцэніроўцы замаху ня мае роўна ніякага угрунтаваньня».

Правакацыйную вэрсію, высунутую польскім друкам, аб тым, што замах на пасольства інсцэніраваны самім пасольствам, катэгарычна адхіляе сёньня гутарка прадстаўніка газэты «Момэнт» з пракурорам, які вядзе сьледзтва па справе аб замаху. Пракурор заяўляе, што гэту вэрсію неабходна зусім адхіліць.

Газэты паведамляюць, што знаряду будзе зроблена другая дэталёвая экспэртыза, але аднак нішто не перашкаджае гэтым газэтам па-ранейшаму пашыраць думку аб малой узрыўной сілы знаряду. Сьледчая ўлада, баццам, напала ўжо на сьлед. Сьледчымі зроблена некалькі вобыскаў і між іншым на кватэры ў сына аднаго выдатнага пятлураўскага дзеяча Лукашэвіча, які жыве ў доме ля савецкага пасольства, адкуль вялася падрыхтоўка замаху. Па вестках газэт аднак ня відаць, каб хто быў арыштаваны па гэтай справе.

«Экспрэс Паранны» працягвае зьмяншаць значэньне замаху, падкрэсьліваючы ўсяго толькі, быццам «дэманстрацыйны характар». У супярэчнасьць першым заявам экспэртызы, што адказная машына была зроблена буйнымі спэцыялістымі. «Экспрэс Паранны» заяўляе ўжо цяпер, што замах падрыхтоўваўся дилетантамі, ці людзьмі зацікаўленымі ў тым, каб выбуху зусім ня было, ці каб у выніку ня значнага выбуху, пасольства мала было пашкоджана. Газэта сьцьвярджае, што знарад быў набіты дрэнным порахам.

«Кур'ер Цодзенны» працягвае антысавецкае цкаваньне, сьцьвярджаючы, што ў савецкім пасольстве, у час калі знайшлі адкую машыну, нікога ня было дома. Газэта і далей, пасьля ўжо таго як пракурор афіцыяльна адхіліў вэрсію аб «інсцэніроўцы выбуху савецкім пасольствам», налягае на сваём, што гэта была «інсцэніроўка замаху».

Аднак, агульнае ўражаньне ад сёньнешніх выступленьняў польскага друку такое: прыказана ўмерыць пыл, і газэты, якія пасьпелі ўжо набіць руку на антысавецкай кампаніі, «адступаюць з боем», працягваючы накідаць сабе шчэліну, каб у выпадку патрэбы — узьняць ізноў цкаваньне.

ЗАМЕЖНЫ ДРУК АБ ЗАМАХУ НА САВЕЦКАЕ ПАСОЛЬСТВА У ВАРШАВЕ

БЭРЛІН, 29. Перадавая «Дойчэ Цэйтунг» пад загалоўкам «Новае Сараева» прысьвечана замаху на ўзрыў савецкага пасольства ў Варшаве. Газэта піша:

«Варшаўскі акт напамінае акт забойства прынца ў Сараеве ў 1914 г. Варшаўскія кіраўнікі маюць перад сабою яўную мэту і выразна ўяўляюць сабе магчымыя вынікі сваіх дзеяньняў. Мы тут маем спробу прымусіць польскую дзяржаву да вайны супроці бальшавізму. Няма сумненьня ў тым, што злачынства падрыхтавана Заходняй - эўрапейскімі коламі».

Без галавакружэньня ад посьпехаў, без апартуністычнага ўпадніцтва пры цяжкасьцях—цьвёрдым крокам уперад да сацыялізму!

БАЯВЫ АГЛЯД

1 мая 1930 г. будзе баявым аглядам сіл пралетарскай рэвалюцыі ў абстаноўцы абвастраючагася крызісу капіталізму і нарастаючай рэвалюцыйнай хвалі. Крызіс у Амэрыцы, грамадзянская вайна ў Кітаі, мільёны беспрацоўных ў Эўропе, сотні мільёнаў, якія стогнуць пад ботам акупантаў і прыгнятальнікаў, калёсальныя посьпехі будаўніцтва сацыялізму ў Савецкім Саюзе—усё гэта згуртоўвае мільёны пралетараў і вялізарныя масы калёніяльных рабоў у рэвалюцыйную армію. Сударагі стабілізацыі, уздым рэвалюцыйнай хвалі—яскравы доказ правільнасьці прагнозу VI-га кангрэсу Камінтэрну аб трэцім пэрыядзе разьвіцьця пасьляваеннага капіталізму.

Чым бліжэй мы падыходзім да непасрэднай рэвалюцыйнай сітуацыі, тым больш ўпэўняюцца масы ў контр-рэвалюцыйнай ролі ўсіх сацыял-фашыстых, тым большыя масы рабочых становяцца пад сьцягі кампартый, згуртоўваюцца вакол Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Ва ўсіх капіталістычных краёх у дзень 1 мая пралетарыят узмоцніць свае баявыя калёны для рашаючага штурму дыктатуры буржуазіі, для барацьбы за дыктатуру пралетарыяту. 1 мая міжнародны пралетарыят ашчэ раз прадэманструе сваю клясавую салідарнасьць з пралетарыятам і працоўнымі масамі Савецкага Саюзу і сваю гатоўнасьць даць адпор спробам імпэрыялістых запаліць факел контр-рэвалюцыйнай вайны супроць Савецкага Саюзу. У дзень 1 мая мы пашлем гарачае прывітаньне ўсім пралетарам, усім прыгнечаным ва ўсіх кутках сьвету. Мы вітаем нашых братоў па клясе ў фашысцкай Польшчы і Зах. Беларусі.

У Савецкім Саюзе мы сўтупілі ўжо ў другі год сацыялістычнай пяцігодкі. Усе даныя, якія мы маем гаворадь аб тым, што плян другога году пяцігодкі будзе цалкам выкананы.

Усе прадраканьні нашых клясавых ворагаў аб правале пяцігодкі, усе скаргі правых апартуністых аб праваемернасьці тэмпаў жыцьцё разьбіла ўшчэнт. Пяцігодка будзе выканана за 4 гады як у СССР, так і ў БССР.

Увесь ход сацыялістычнага будаўніцтва поўнасьцю сьцьвярджае правільнасьць генэральнай лініі партыі. Магутная хваля сацыялістычнага спаборніцтва, мільённая армія ўдарнікаў—вось канкрэтныя вынікі працы партыі за пэрыяд з 1 мая 1929 году па 1 мая 1930 г. За гэты-ж пэрыяд вырасьлі новыя гіганты—заводы, саўгасы, чыгункі, электрычныя станцыі.

Ашчэ больш узмоцніць тэмп нашай працы на прадпрыемствах, ашчэ лепш арганізаваць сацспаборніцтва і работу ўдарных брыгад, абавязкова забясьпечыць 100-процантнае выкананьне ўсіх колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну на 1929-30 г., ашчэ мацней ударыць па ўсіх тых, хто зрывае прадпрыемствы—вось нашы важнейшыя задачы ў дзень 1 мая.

Вялізарнейшыя дасягненьні мы маем ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Гіганцкае разьвіцьцё саўгаснага будаўніцтва, значнае перавыкананьне пяцігадовага пляну калектывізацыі гаворыць аб тым, што за апошні год партыя дасягнула вялізарнейшых посьпехаў у галіне сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі.

Посьпехі ў галіне калектывізацыі, суцэльная калектывізацыя раду раёнаў паставілі ў парадак дня задачу пераходу ад палітыкі абмежаваньня і выцісканьня кулака да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Усё наша сацыялістычнае будаўніцтва адбывалася ў абстаноўцы абвостранай клясавай барацьбы, шалёнага супраціўленьня капіталістычных элемэнтаў сацыялістычнаму будаўніцтву. Пад кіраўніцтвам партыі рабочая кляса і беднота ў саюзе з серадняком разгарнулі пасьпяховае наступленьне на капіталістычныя, на клясава-варожыя элемэнты і ў выніку гэтага, мы маем тое, што сілы рэвалюцыі ўзмацніліся, а сілы контр-рэвалюцыі атрымалі рашаючы ўдар.

Наша партыя абараняла генэральную лінію ня толькі ад клясава-варожых элемэнтаў, але і ад праваапартуністычных ударaў і «левых» загібаў. Апошні год быў годам жорсткай барацьбы ўсёй партыі і беларускай арганізацыі са спробамі правай апазыцыі зьмяніць генэральную лінію партыі, затармазіць тэмп сацыялістычнага будаўніцтва, пайсьці на паклон кулаку і нэпману. За апошні год партыя выкрыла варожую нам сутнасьць ідэалёгіі правага ўхілу, яго капітулянцкі характар; правадыры правага ўхілу пад ударамі партыі капітулявалі перад ёй. Лепш, мацней біць па правым ухіле як у тэорыі, так і на практыцы, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай у сучасны пэрыяд—вось адна з важнейшых задач.

Побач з барацьбой супроць правага ўхілу партыя разгарнула вялізарную барацьбу супроць «левых» анты-серадняцкіх перагібаў, якія асабліва адчуваліся пры правядзеньні калектывізацыі ў цэлым радзе раёнаў, у прыватнасьці і ў нас у Беларусі. Артыкуламі т. Сталіна, дырэктывамі ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б партыя павяла рашучую барацьбу з усімі перагібамі ў галіне калектывізацыі, з усімі скажэньнямі лініі партыі пры арганізацыі калгасаў, пры правядзеньні раскулачваньня. За апошні час партыя і ў гэтай галіне дабілася вялікіх посьпехаў. Партыя і ее атрад КП(б)Б дала бязьлітасны адпор усім «левым» загібшчыкам, якія на справе дапамагалі правым ухілістым. Ашчэ больш разгарнуць барацьбу з «левымі» загібамі, узмацніць пільнасьць партыйных мас да «левых» скажэньняў лініі партыі, зьяўляецца аднэй з галоўнейшых задач партыі.

У барацьбе на два франты супроць правых і «левых» апартуністых і наша партыя ашчэ загартавалася.

КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б за апошні год выкрыла цэлы рад апартуністычных окажэньняў лініі партыі і ў нацыятаньні. Партыя дала рашучы адпор усім вылазкам нацыянал-дэмакратаў, вялікадаяржаўна-расійскіх шавіністых, яўрэйскіх нацыяналістых і шавіністых. Працягваць узмацняць гэту барацьбу—адна з баявых задач. Посьпехі ў галіне разгортваньня самакрытыкі значна павысілі аўтарытэт партыі, яе сувязь з масамі і забясьпечылі большую выразнасьць клясавай лініі ў рабоце ўсіх нашых арганізацый.

У дзень 1 мая ашчэ больш згуртуем свае рады вакол бальшавіцкай партыі, вакол ее Ленінскага ЦК.

СУПРОЦЬ ПРАВЫХ АПАРТУНІСТЫХ, ВЫРАЗІЦЕЛЯЎ КУЛАЦКАЙ ІДЭАЛЁГІІ І „ЛЕВЫХ“ ЗАГІБШЧЫКАЎ---САЮЗЬНІКАЎ ПРАВЫХ, ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ!

Якуб Колас

Жыцьцё ня йдзе, а шкваліць бурай

Жыцьцё ня йдзе, а шквaліць бурай,
І што ні момант, што ні час,
Расьце нарыў і творчасьць мас
І за падмуркамі падмурак
Уэводзіць моцная натура—
Нядаўні раб і сьвінапас,
Краіна грозная Саветаў,
Саюз рабочых і сялян,
Сягае ўперад, як тытан,
І ўзьлёт фантазіі паэтаў,
Праўсходзіць поступ яе гэты,
Разьбіўшы ў прах адвечны эман.
І гэты поступ чуюць горы,
І нетры цёмныя зямлі,
І нашы цхіія палі,
Дзе з веку ў век свае ўзоры
Пісалі сохі ў нэндзы—горы,
Ды смутак сеялі ў ральлі.
Зьнікаюць межы і загоны,
Прытулкі быльніку, цыпышы
Пад пераможны гук машын,
А на званіцах йоўкнуць звоны,
Бо ўзносіць сьцяг на іх чырвоны
Рука згуртованых дружын.
Балоты, гіблыя балоты,
Дрыгвы і хмызьняку брыжы,
Дзе толькі сыкалі вужы
Ды палахлівыя чароты
Шуршалі шолахам сумоты
Над рудой жыжкаю іржы,
Цяпер прыемна цешаць вока,
Як стэпы, пожнямі ляжаць;
На іх буйне сенажаць,
На іх красуюць ніў валокі,
На іх паложана глыбока,
Размаху творчага пячаць.

* * *

Паслухай — гукат, рух мільёнаў.
Шуміць зямля, гудзе завод—
Вялікі чуецца паход.
У тэмпе бурнага разгону
Пад сьцягам багрыста-чырвоным
Рубеж кладзе наш кожны год.

(З паэмы «На шляхох волі»).

Віктар Казлоўскі

РЫТМ ЭПОХІ

Чуецца тупат напружаны дзён,
Чуецца звон ператалленай бронзы—
Гэта няўтомнае крочыць жыцьцё
Праз буру
і змрок,
і пагрозы.

Кроў узьнімае імклівасьці шторм,
Рукі і мозг да работы імкнуцца.
Адновіць зямлю й неабсяжны прастор
Напружаны пэнт рэвалюцый.

Кожны наш крок—новы скарб перамог,
Кожны наш рух—гэта творчыя рытмы.
Сьвет мы ўзялі ў капітальны рэмонт,
Здолеем новую эру стварыць мы.

Рухае сьвет у напройдзены рэйс
Мускул магутны індустрыі.
Памяць пра нашыя дні не памрэ,
Дні начуваныя, мудрыя.

Быццам зямля павярнула свой рух,
Другую рысуе, арбіту—
Гэта жыцьця шчэ нябачаны зрух,
Гэта гісторый раптоўныя спрыты.

Цьвёрдыя поступы творчых атак
Закон скасавалі сінайскі.
А, ты інквізітар, за міт пра хрыста
Ня купіш ідэй волі наскай.

Даволі ўжо падзілі вы маскарад
Для зьдзекаў, пакут і для ганьбы.
Нас не спалохаюць наступы здрад—
Шквалам разьбітыя дамбы.

Хто гэта там галасуе за сум?
За песьні пяшчот і ідыцій?
Здраду душы аддамо мы пад суд,
Напоўнім жыцьцё мацадымі ўздымамі.

Хто гэта там надарваны настрой
Вынес на продаж чужынцам?
Хто там душу разьмяняў на факстрот
І з песьнямі вышаў маніцца?

Рытміку гэтніх вялікіх падзей
Чужынцы адно не адчуюць!..
Змагацца...
тварыць...
і жыцьцём мацадзець
Дый ісьці ў тую даль залатую.

Трубіць
Трывогу
Трывожны
набат.
Бунты
душа
узьнімае.
Штурмы...
паход...
барацьба...
барацьба
За ўрачыстасьць
Настрычніка
й МАЯ.

Менск 28/IV—30 г.

Сацспаборніцтва--магутны вагар баяздольнасьці Чырвонай армії

Высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, пасьпяховае выкананьне пяцігодкі, бурны рост калгаснага руху — асноўных мас сялянства, пасьпяховае правядзеньне ў жыцьцё новай палітыкі партыі: ліквідацыі кулацтва, як клясы на базе суцэльнае калектывізацыі—усё гэта ўзмацняе сацыялізм у нашай краіне, забясьпечвае выкарчоўваньне рэштак капіталізму і пераджае творчую энэргію і ініцыятыву самых шырокіх мас пралетарыяту і прапоўнага сялянства. На аснове гэтага забясьпечваецца ўзмацненьне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Усё гэта павялічвае сымпатыі да нашай краіны соцен мільёнаў пралетараў і прыгнечаных прапоўных капіталістымі, як да свае сацыялістычнае бацькаўшчыны, дапамагае мабілізацыі соцен мільёнаў прыгнечаных пад рэвалюцыйныя сьцягі Камінтэрну.

Побач з нашымі посьпехамі, паглыбляецца шалёная нянавісьць да нас адміраючага, гнілога капіталізму, які правільна бачыць у нашых посьпехах сваю пагібель. Вось, чаму гэта шалёная нянавісьць ператвараецца ў шалёную падрыхтоўку вайны супроць нас.

Зараз мы пераживаем момант адкрытай падрыхтоўкі вайны супроць СССР. Гэта патрабуе ад рабочае клясы і працоўных мас сялянства, каб кожны дзень мірнай перадышкі быў максымальна выкарыстаны для пабудовы сацыялізму ў гістарычна кароткі тэрмін, патрабуе выкананьня намечаных партыяй тэмпаў сацыялістычнай будоўлі, як асновы ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны, патрабуе ўзмацненьня падрыхтоўкі працоўных да абароны краіны, патрабуе ўзмацненьня ўвагі да Чырвонай армії, да вернага, надзейнага вартаўніка сусьветнага сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэта, як ніколі, накладае абавязацельства на Чырвоную армію быць на пагатове; сваёй баявой падрыхтаванасьцю забясьпечваць мірнае сацыялістычнае будаўніцтва. Для таго, каб у сваёй баявой падрыхтоўцы не адставаць ад высокіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, **часьці Чырвонай армії шырока ўмяшваюць сацыялістычнае спаборніцтва, пачынаючы з мінулага году.** Той вялізарны ўздым, які створаны, дзякуючы сацыялістычнаму спаборніцтву, накіроўваецца на выкананьне асноўных задач на баявой падрыхтоўцы. Пры гэтым, кожная часьць прыстасоўна да сваіх асаблівасьцяй і задач, на паасобных этапах вызначае найбольш важныя для сябе пытаньні ў баявой падрыхтоўцы. Так, напрыклад, многія часьці абвясьцілі стралковы месячнік пад лёзунгам ліквідацыі свае стралковае нпісьменнасьці, дасягненьня лепшых вынікаў у стралковай падрыхтоўцы.

Вынікі сацыялістычнага спаборніцтва ў кожнай часьці і падразьдзяленьні вельмі выразныя. У тактычнай падрыхтоўцы вынікі за вімовы пэрыяд амаль раўняюцца гадовым вынікам мінулага году. Яны атрымаліся, дзякуючы таму, што кожныя тактычныя заняткі праходзілі з пункту погляду выкананьня дагавору па сацыялістычным спаборніцтве.

У стралковай падрыхтоўцы мы маем бязумоўныя дасягненьні, ня гледзячы на павышэньне патрабаваньняў у гэтым годзе.

Дысцыпліна значна ўзмацнілася, аб чым можа сьведчыць факт зьнімэньня праступкаў на 40-50 проц. у параўнаньні з мінулымі пэрыядамі.

Мы маем значны рост палітычнай сьвядомасьці чырвонаармейскіх мас, доказам гэтаму служыць актыўнае падтрыманьне мэтак чырвонаармейцаў і начскладам генэральнай лініі партыі.

Капя 100 проц. чырвонаармейцаў—старапужачых, якія ўвосень пэвінны былі выйсьці ў дэфінітэрміновы водпуск, запісаліся ў калгасы і становяцца актыўнымі будаўніцамі сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі. Чырвонаармейцы пасылаюць у вёску тысячы лістоў, у якіх выкрываюць кулацкую агітацыю, упятваюць свае сем'і ў калгасы. У гэтых лістох яны даюць парады наконт узмацненьня калгасаў і правядзеньня веснавой бальшавіцкай сяўбы.

У асяродзьдзі чырвонаармейцаў і начскладу вырас аўтарытэт партыі, аб чым сьведчыць палітычны ўздым, які выліўся ў масавую падачу заяў аб прыёме ў партыю ў часе дывізійных партканфэрэнцый. Так, у Самарскай кав. дывізіі ў часе дывізійнай партканфэрэнцыі 218 чырвонаармейцаў падалі заявы ў партыю, у Чангорскай кавдывізіі — 280 чал., у Віцебскай—725 чал., у Полацкай—больш за 800 чал. і г. д. Усе яны лепшыя ўдарнікі—рабочыя, батракі, беднякі і сераднякі—калгасьнікі, чырвонаармейцы, камандзіры, дактары і інш.

У Чангарскай кав. дывізіі ўся каманда аднагоднікаў падала заяву аб уступленьні ў партыю, сярод падаўшых заявы—большасьць маладыя сацыялісты—аграномы, тэхнікі і г. д. Гэта сьведчыць аб **узросшай ролі і аўтарытэце партарганізацый ў армії, іх выразнай бальшавіцкай рабоце, аб тым, што парт-арганізацыі стаяць на чале сацыялістычнага спаборніцтва па ўзмацненьні баяздольнасьці армії.**

З недахопаў у сацыялістычным спаборніцтве мы адзначаем наступнае: у некаторых часьцях яксныя паказальнікі ашчэ не адпавядаюць тым абавязацельствам, якія масы на сябе ўзялі. Гэта тлумачыцца, галоўным чынам, слабым кіраўніцтвам сацспаборніцтвам з боку партарганізацыі і начскладу, ня досыць гібкай і выразнай работай штабаў сацспаборніцтва, несыстематычнай праверкай дасягненьняў і недахопаў у сацспаборніцтве. Несыстематычна робіцца падагульненьні сацыялістычнага спаборніцтва паміж часьцямі. Слабы абмен вопытам паміж часьцямі, фабрыкамі і заводамі, якія ўступілі паміж сабою ў сацспаборніцтва. Мы маем адзінкавыя выпадкі ілжэ-ўдарніцтва і несвячасовай барацьбы з гэтым.

Зьлёт ударнікаў БВА, які зараз адбываецца, ашчэ больш забясьпечыць далейшае разьвіцьцё сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, узьняўшы яго на вышэйшую ступень у часьцях Чырвонай армії.

Сацыялістычнае спаборніцтва—магутны вагар узмацненьня баявой падрыхтоўкі Чырвонай армії. Ад індывідуальнага выкліку на сацспаборніцтва да выклікаў падразьдзяленьняў—часьцей, ад індывідуальнага ўдарніцтва да ўдарных груп, аддзяленьняў, узводаў, рот, эскадронаў, палкоў і цэлых дывізій—вось шлях разьвіцьця сацыялістычнага спаборніцтва, які прайшла Чырвоная армія.

На кожны новы выпад капіталістых супроць СССР Чырвоная армія адказвае ўзмацненьнем ударніцтва ў баявой падрыхтоўцы, кожны новы факт шалёнай падрыхтоўкі вайны супроць СССР павялічвае лік ударнікаў і ўдарных часьцей.

1-га мая маладыя байцы Чырвонай армії даюць урачыстае абяцаньне працоўным усяго сьвету гэраічна абараняць заваёвы Кастрычніка, змагацца за справу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Крохмаль.

На рубяжы двух міроў

... А на тым баку пілсудчыкі нагайкамі хвасталі сялян і заганялі іх у хату, каб сяляне не глядзелі на бальшавіцкую сяўбу

З высокага правага берагу рэчкі Заходняй Дзьвіны (Полаччына) як на далоні відна вёска Слабада, відна Польшча.

Я з вакна маёй кватэры—заседжага дому глядзеў на той бок дзяржаўнай мяжы, дзе на вузкіх загонах зямлі селянін адиаконным плугам араў сваю палоску.

А дрысычане расказваюць:

— Тыдняў два таму назад, калі ў мястэчка Дрыса прыбыла трактарная калёна, сотні працоўных сялян з вакольных вёсак прышлі глядзець гэтых сталёвых коняй, бо раней ніколі іх на бачылі.

І з таго боку з Польшчы, з вёскі Слабада і з іншых прымежных вёсак таксама прыходзілі сяляне са сваіх хат, пазьбіраліся групамі і прагнымі вачыма глядзелі на савецкую Дрысу, дзе грукацелі трактары.

Але раптам налацела некалькі конных паліцэйскіх жандара-пілсудчыкаў, якія бізунамі сьцябалі працоўных сялян, заганялі іх назад у хаты, загаладалі завесіць вокны дываванамі з боку ад м. Дрыса.

Увесь час, пакуль гулі трактары, пакуль адбываўся шматлісячны мітынг, на тым баку рэчкі Заходняя Дзьвіна разьяжджалі пілсудчыкі і заганялі сялян у хаты. І тады сяляне адкрывалі фортачкі ў вокнах і ўвесь час сачылі за трактарамі, як яны пасьля мітынгу стройнай калёнай адзін за адным выехалі з мястэчка Дрыса і на шырокія калгасным полі прымежнага калгасу «Эмэс» (праўда) пачалі араць зямлю, зьнішчаць межы.

— І заўсёды,—кажа калгасьнік Анупрэй,—як толькі ў мястэчку Дрыса, праводзіцца якое-небудзь рэвалюцыйнае масавае сьвята, як, напрыклад, сьвята—1-га мая, Кастрычніцкая рэвалюцыя,—пілсудчыкі тады ня сьпяць. Яны на конях гойсаюць па палёх ды па вёсках, разганяюць сялян, каб яны не зьбіраліся натоўпам, не глядзелі на савецкую Беларусь.

Але-ж ці ёсьць на сьвеце такая сіла, якая-б змагла прымусіць зарубежных братоў—працоўных Заходняй Беларусі не глядзець на савецкую Беларусь.

Такой сілы на сьвеце няма.

Праз драцяную калючую загароджу, што працягнута ўздоўж дзяржаўнай мяжы на стыку трох дзяржаў: СССР, Латвіі і Польшчы—(недалёка ад прымежнага калгасу імя Дзяржынскага), праз шырокую рэчку Заходняе Дзьвіна кожны дзень чуюць зарубежныя браты працоўнай Заходняй Беларусі новую бадзёрую рэвалюцыйную песьню чырвоных пагранічнікаў і дрысенскай моладзі.

Вось і зараз, калі пішу гэтыя радкі, па куліцы ў м. Дрыса чуваць:

Смела мы в бой пойдем
за власть советов...

І гэта песьня чырвоных нашых пагранічнікаў у ціхі цёплы веснавы вечар водгулькем аддаецца на той бок мяжы —ў Польшчы. А словы песьні.

«Ковать мы не дадим
для нас оковы.

Тут, на мяжы сацыялістычнага капіталістычнага сьвету—адказ фашыстым на іхнюю шалёную падрыхтоўку да вайны супроць Савецкага Саюзу.

* * *

...А калгасьнікі калгасу імя К. Маркса сёньня, 22-га красавіка, як ніколі ў добрым настроі. Да іх сёньня прыбыла трактарная калёна—9 трактараў.

Сотні сялян-калгасьнікаў усыпалі поле, прышлі таксама і тыя, што выпісаліся былі з калгасу, што сёньня ашчэ ліставіцца.

—«А скажы, Валодзька (сакратар калгасу імя К. Маркса), скажы, ці паедуць трактары вунь на тую палоску,—пытае жанчына.

— Паедуць і будуць араць.

— Дык трасца-ж вашай матары з гэтым калгасам. Гэта-м на той палосе восем пур клалася (пура—мерка да 3-х пудоў жыта), а вунь на той палосцы—два пуры. А цяпер-жа не пазнаеш, дзе была мая палоска,—лемантуе жанчына, што не пайшла ў калгас.

— Не пазнаеш, правільна, кажуць калгасьнікі.

Іх твары сёньня, як ніколі вясёлыя, а настрої бадзёрыя, яны рады, што да іх прыехалі трактарыстыя з гэтымі сталёвымі конямі. Час ад часу поюць калгасьнікі сталёвага каня халоднаю водою,—астуджваюць радыятар трактара.

І тады трактар зноў, кавыляючыся на полі, пашоў на вузкіх, ашчэ сёньня загонах. Калгасьнікі, каб паспрабаваць і адчуць работу трактара, узьлазяць на крылы трактараў, аб'язджаюць сваё калгаскае поле.

Вось узыйшлі пярэднія калёсы трактара на мяжу, прыціснулі яе заднія калёсы сваімі жалезнымі шыпамі ашчэ мацней распласталі мяжу, а два сталёвыя кругі—дыскі разрэзалі яе на часткі, а вялікія сталёвыя плугі дакончылі мяжу. зруйнавалі яе.

І тады калгасьнікі казалі:

— Мяжа памерла, больш ня ўстане.

Мясцамі трактар, дзе былі нізіны і стала ашчэ вада (на Дрысіншчыне глеба гляістая), прыпыняўся, сапзіўся. Тады буксавалі заднія калёсы ашчэ глыбей вяз трактар у ільготную зямлю.

— А што я казаў, што трактар сядзе, ну і сеў, слабо яму цяпер выбраціца, казаў «індывідуальнік», які не запісаўся ў калгас. Ён быў здаволены калі трактар прыпыняў сваю работу.

Але калгасьнікі ахвотна падыходзілі пад заднае калясо трактара і гады «коньі» выскакваў на паверхню зямлі і зноў проста ішлі ломяхі плуга да мяжы, руйнавалі яе.

Трактарысты ашчэ мацней націскаў на педалі трактара, шпа[illegible] крупіліся калёсы, гудзеў матор, плугі ўзьнімалі і рвалі дёрн, адкладалі зямлю роўнымі пластамі.

І падыходзілі сяляне да багазны, бралі зямлю ў рукі, расьціралі яе, як быццам-бы да гэтага часу ніколі ня бачылі зямлі.

— А былі і такія, што, ідучы з хаты на поле, бралі з сабой аршыны і вось зараз, падышоўшы да багазны, дзе прайшоў трактар, мералі зямлю ўшырыню і ўглыбіню.

— Чатыры браткі вяршкі глыбіні, каля паўтара аршын шырыні. Ніколі такі аралі, казаў адзін селянін.

— От табе і трактар, каб канём, дык па гэтай паласе-б корпуўся-б каля тыдню, а трактары адразу заарані паласу, ды суседаву кранулі, казаў другі.

— Вось цяпер ня пойдзем да кулака, ня будзем прасіць яго дапамогі, казалі тыя беднякі, што раней да ўступленьня ў калгас, вымушаны былі прасіць заможнікаў і кулакоў заараць іх зямлю, узяць яе ў арэнду.

Трактар канчаткова падрэзаў карэньні кулацкай эксплёатацыі батрацтва, бед якаў і нават сераднякоў.

Трактары робяць цэлую рэвалюцыю ў раёне. Іх калгасьнікі сустракаць з чырвонымі сьцягамі, абіваюць парогі ў райкоме партыі, у райвыканкоме, у райкалгасаюзе, просячы пакінуць трактары хаця-б ашчэ на пару дзён, або прысылаць трактары ў іхні калгас, а ўсіх калгасаў у раёне 36. Трактары разьязджаюць ад калгасу да калгасу. Кожны дзень, трактарная калёна ў сярэднім арэ 20-22 гект. зямлі. Трактары працуюць у адну зьмену, бо не хапае трактарыстых. Як вынік працы трактараў, у раёне наглядаецца прыліў у калгасы беднякоў і сераднякоў. За некалькі дзён паступіла да 120 заяў аб залічэньні ў калгас.

* * *

...А на той бок дзяржаўнай мяжы, сяляне адиаконнымі плугамі араць вузкія загоны зямлі. Чуючы гул трактараў у прымежных калгасах, часта прыпыняюць сваіх коняй і прагнымі вачыма глядзяць на савецкую Беларусь. Яны—зарубежныя браты—працоўныя Заходняй Беларусі, жывуць думкамі рабочых і працоўных сялян вольнай савецкай Беларусі. Яны бачаць бальшавіцкую сяўбу, зьбіраюцца групкамі, гутарацъ аб ёй, але польскія жандары—фашыстыя разганяюць такія групкі сялян, заганяюць іх у хаты.

— Сёньня мы руйнуем справядчывыя межы паасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. А надыйдзе час, што ня будзе ніякіх меж,—казаў калгасьнік калгасу імя Дзяржынскага, на масавым мітынгу ў дзень першага высеву калгасьнікаў ў поле.

Яго словы далёка былі чуваць па той бок дзяржаўнай мяжы, у прымежных вёсках Польшчы і Латвіі.

Брыгада газ. «Беларуская Вёска»
Янка Шкадарэвіч.

Ў краёх капіталу

Напярэдадні 1 мая

ПАРЫЖ ПЕРАТВОРАНЫ Ў ВАЕННЫ ЛЯГЕР

ПАРЫЖ, 29. Як паведамляе агэнцтва Гавас, на ўчарайшай нарадзе кіраўніцтва паліцыі ваенных улад пастаноўлена «паводле прыкладу мінулых гадоў забараніць 1 мая вулічныя дэманстрацыі і рашуча прасякаць спробы маніфэстацыяй і замахаў на вольнасьць працы. Віноўнікаў безадкладна перадаваць суду. Чужаземцаў, якія прымуць удзел у першамайскіх дэманстрацыях паліцыя выпле па-за межы Францыі. Звышайныя паліцэйскія сілы Парыжу падпаўюцца жандармэрыяй, як сталічнай, так і выкліканай з правінцыі. Ваенны гарнізон Парыжу і мая ўвесь дзень будзе ў казармах. Гарнізон поўнасьцю прадастаўлены ў распараджэньне паліцыі. Пытаньню аб першамайскіх дэманстрацыях будзе прысьвечана новая нарада пад старшынствам «самаго» Гардзье, якая будзе заўтра склікана.

РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ МАРАКІ АМЭРЫКІ ЗА ПЕРШАМАЙСКУЮ ЗАБАСТОЎКУ

НЬЮ-ЁРК, 28. Канфэрэнцыя рэвалюцыйных маракоў прыняла рэзалюцыю, якая выказваецца за правядзеньне забастовак і дэманстрацый у дзень 1 мая. Гаксама прынята рэзалюцыя, якая патрабуе **абвяшчэньня забастоўкі на ўсіх караблях, што адплываюць з партоў ПАЗШ з ваенным снарамжэньнем і войскімі часьцямі для барацьбы з рабочымі іншых краёў.** Канфэрэнцыя выбрала трох дэлегатаў на надыходзячы пяты кангрэс Прафінтэрну.

ПЕРШАМАЙСКАЯ АДОЗВА АЎСТРЫЙСКАЙ КАМПАРТЫІ

ВЕНА, 22. У сваёй першамайскай адозве ЦК аўстрыйскай кампартыі заклікае працоўных да барацьбы супроць фашысцкае дыктатуры ўраду Шобэра, супроць закону аб тэроры сацыял-фашызму, за Савецкі Саюз — бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету, за рабоча-сялянскі ўрад і дыктатуру пралетарыяту ў Аўстрыі.

РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ ЗМАГАНЬНЕ ВЭНГЭРСКІХ МЭТАЛІСТЫХ

ВЕНА, 28. Як паведамляюць з Будапэшту, забастоўка мэталістых на судабудаўнічых вэрфях «Ганд-Данубіус» працягваецца ўжо сёмы тыдзень. Мэталістыя Будапэшту, а ў асаблівасьці рабочыя іншых прадпрыемстваў канцэрну «Ганц Данібіўс» выказваюць поўную салідарнасьць з бастуючымі і адлічваюць на іх карысьць кожны тыдзень ад аднаго да двухдзеннага заработку. Каб пазбавіць бастуючых дапамогі ад іншых рабочых, адміністрацыя ўсіх прадпрыемстваў цяжкай прамысловасьці ўмовілася пачаць масавыя звальненьні рабочых і перавод на скарочаны тыдзень. Прадпрыемцы такім шляхам спадзяюцца спыніць прыток сродкаў у стачачны фонд і ўзяць бастуючых голадам.

«ДЗЭЙНІЧАЦЬ БЯЗ ЛІТАСЬЦІ»

ТОКІЁ, 25. Як паведамляюць з Харбіна, улада прымае выключныя меры да падрыхтоўкі да 1-га мая, у сувязі з пашырэньнямі анты - імпэрыялістычнага руху сярод кітайскіх працоўных у паўночнай Манчжурыі і сярод рабочых у паўднёвай Манчжурыі. Паліцыя сьцьвярджае, што ў Харбіне і Фудзядзяне (прыгарад Харбіну). рыхтуецца першамайская забастоўка і дэманстрацыя. У горадзе сканцэнтраваны буйныя вайсковыя часьці. Галоўны начальнік абобага раёну 3-х Усходніх правінцый выдаў загад «дзэйнічаць бяз літасьці». У загадзе падкрэсьліваецца, што «самая малая неасьцярожнасьць можа пацягнуць за сабой пакараньне сьмерцю». (ТАСС).

НА АДКРЫЦЬЦІ ТУРКСІБУ

„ТУРКСІБ—ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЯ ШКОЛА“

АЙНА-БУЛАКА, 29. Урадавы цягнік прыехаў да месца змычкі. На ўсіх станцыях яго віталі будаўнікі мясцовага насельніцтва і прыяжджаючыя з аўлаў на конях качаўнікі. Вялізарнае ўражаньне зрабіў мітынг у От-Ілі, на самым цяжкім вучастку працы, на фоне пасьпяховага пабудаванага маста праз раку Ілі. Тав. Рыскулаў на казакскай і расійскай мовах вітаў першую савецкую дарогу, ангельская прамова Катаямы пераведзена на казацкую і расійскую мовы. З захапленьнем спатканы Шатаў. Тав. Шатаў у заключэньні зьвярнуўся да дзяцей —маленькіх турксібчыкаў, будучых гаспадароў дарогі. Пасьля мітынгу ўдзельнікі прайшлі паўтара кілёмэтры пехатою разглядаючы мост, на якім на зваротным шляху пройдзе дэлегацкі цягнік. На мітынгу на станцыі Ажаляман старшыня саўпаркому Казакстану Ісаеў гаварыў аб значэньні Турксібу для Казакстану—былой царскай калёніі. Горача вітаў Турксіб дзядок - калгасьнік з Кіррэспублікі, прамова якога пераведзена тав. Ісаевым на расійскую мову.

Тав. Шатаў адзначыў, што Турксіб з рознапляменным складам рабочых—інтэрнацыянальная школа. Перад упрыгожанымі трыбунамі госьці і прадстаўнікі прэсы ўсяго сьвету чакаюць пачатку ўрачыстасьцяй.

Чырвоны Май у краі белага тэрору

Фашысцкая дыктатура ў Польшчы мабілізавала ўсе рэакцыйныя сілы, сваю паліцыю яўную і тайную, сацыял- і нацыянал-фашыстых, клер усіх рэлігій, шаіх агентаў усіх нацыянальнасьцяй, мабілізавала на зламаньне рэвалюцыйнай волі пралетарыяту, на разьвіцьцё баявых першамайскіх выступленьняў усіх эксплёатаваных працоўных мас.

Праведзены паўсямесныя масавыя трышты — Кракаў, Варшава, Львоў, Вільня, па невялічкіх мястэчках і вёсках. Балай няма пралетарскага асяродку, **дзе не разгуляўся-б перадмайскі белы тэрор, дзе-б дэфэнзыва не вытрывала з радоў барацьбітоў больш актыўных рэвалюцыянэраў.**

Фашысцкая дыктатура напружвае ўсе сілы, выкарыстоўвае ўсе магчымасьці, каб першым чынам зьнішчыць авангард рабочай клясы — кампартыю. Ідэі бальшавізму ўсё глыбей-шырэй прасякаюць у гушчу працоўных і эксплёатаваных мас. **Кампартыя зьяўляецца адзінай сілай, дамінуючай і мабілізуючай** усе рэвалюцыйныя атрады супроць фашысцкай дыктатуры і яе крывавых імпэрыялістычных плянаў. Таму лязо белага тэрору накіравана ў першую чаргу супроць кампартыі, каб пазбавіць масы кіраўніка і правадыра ў вызваленчай барацьбе, пазбавіць асабліва ў дзень міжнароднай рэвалюцыйнай перадачкі, у дзень агляду рэвалюцыйных сіл, у дзень 1-га мая, які заўсёды заводзіць на капіталістых жах і завастрае іхнюю шалёную нянавісьць.

1-е мая гэтага году пралетарыят капіталістычных краёў сустракае пад знакам нябывала-грозных падзей, сустрае ў надзвычай напружанай разгоначнай палітычнай атмасферы.

Гісторыя ня знае ашчэ такога раманту і глыбіны крызісу капіталізму, які ранік ва ўсе краі зямное кулі. Выразная тэнданцыя на завастрэньне гэтага крызісу а ўсёй вачавідкасьцю паказвае, што сусьветны капіталізм скочваецца на нахільнай плошчы.

Банкір сьвету — ПАЗШ, які займае галову сусьветнай капіталістычнай эканомікі, таксама курчыцца ва ўзрастаючым крызісе, ён адыгрываючы ролю стабілізуючага фактару пасьляваеннага капіталізму, стаў цяпер фактарам раскладу і развалу сусьветнага капіталу.

Ніколі так яскрава не выступаў крызіс капіталістычнага ладу, фашысцкага рэжыму. Рэвалюцыйны рух ахапляе ны толькі мэтраполіі, але і калёніі. У рэвалюцыйную армію п

БЯРЭЦЕ ПРЫКЛАД З ЛЕПШЫХ

У дзень 1 Мая калгасы паведамляюць аб выніках гэраічнай барацьбы за бальшавіцкую сяўбу

Парыцкі раён ужо выканаў звыш 50 проц. пляну сяўбы

У выніку сацспаборніцтва калгас „Селянін“, Гомельскай акр. за 10 рабочых дзён засеяў 59 проц. свайго яравога кліну



Ударнікі-пчаводы (калгас «Расьсьвет Пераможца»)

Паказваем прыклад высокай прадукцыйнасьці працы

ПЛЕШЧАНІЦЫ, Менскае акругі. (Па тэлефону). Гісторыя нашага калгасу, арганізаванага 1-га мая 1929 году і таму названага **імем 1-га Мая** зьяўляецца лепшым довадам таго, што толькі калектыўная форма працы можа палепшыць сялянскае жыцьцё, што толькі сацыялістычная перабудова вёскі ўздыме сельскую гаспадарку. Летась у сёнешні дзень у калгасе налічвалася толькі 5 бядняцкіх гаспадарак. Калгас меў ня больш 154-х гэкт. зямлі. Паступова ён рос і мацнеў. Уся ўвага калгасьнікаў была зьвернута на паляпшэньне вытворчасьці, на ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы, на ліквідацыю няпісьменнасьці і ўзьняцьце культурнага ўзроўню калгасьнікаў наогул. Усё гэта спрыяла таму, што калгас увесь час пашыраўся і колькасна і якасна. У сучасны момант у склад калгасу імя 1-га Мая ўжо ўваходзіць 2 вёскі, 2 пасёлкі і 8 хутароў. Ён яднае 63 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі — 295 чалавек. Ворная плошча калгасу складае ўжо 1.160 гэктараў. Мы маем 82 рабочыя кані, 130 малочных кароў, 90 сьвіней, 70 штук маладняка рагатай жывёлы і патрэбных прадуктаў. Яравы клін калгасу складае 325 гэкт. На сёнешні дзень мы плян веснавой сяўбы выканалі больш, чым на 12 проц., і разгортваем палявыя работы ўзмоцненым тэмпам.

Калгас імя 1-га Мая рашуча ўзяўся за перабудову сваёй гаспадаркі ў жывёлагадоўчую гаспадарку. Будуецца сьвінарнік на 250 матак, цялятнік — на 250 цялят. Калгас набыў абсталяваньне для пераапрацоўкі малака. Сёлета ў нас вызначаецца пабудаваць мэдычны пункт.

Нядаўна антыкалгасны элемэнт, які пралез у калгас, рабіў спробу разбурыць яго з сярэдніны, але гэта не ўдалося. Асноўная маса беднякоў і сераднякоў калгасьнікаў дала рашучы адпор шкоднікам калгаснага руху і хутка ачысьціла калгас ад варожых элемэнтаў. Гэта спрыяла палежнай арганізацыі сяўбы.

І сапраўды, нашы калгасьнікі паказваюць прыклады высокай прадукцыйнасьці працы. Брагада аратых перазысіла ўсякія нормы выпрацоўкі. Адзін чалавек на параконным плузе заворвае 0,8 гэкт. у той час, як максымальная норма ў нашых мясцох складае 0,6 гэкт.

Першамайскае сьвята калгасьнікі скарыстоўваюць для наладжаньня больш шчыльнай сувязі з вакольнымі індывідуальнікамі. 1-га мая мы ўступаем у спаборніцтва на лепшую арганізацыю вытворчасьці і працы з суседнім калгасам, а таксама на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы з індывідуальнікамі.

Калгасьнікі запэўняюць ЦК УсеКП(б), што яны мабілізуюць усе свае сілы і сродкі на лепшае правядзеньне сяўбы і перавыкаваньне пляну веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі.

ПРАЎЛЕНЬНЕ КАЛГАСУ.

Будзем з гонарам насіць назву членаў калгасу „1-га Мая“

КРУПКІ, Аршанскай акругі. (Па тэлеграфу). **Наш калгас імя 1-га Мая** ўжо існуе два гады. Тады ў яго склад уваходзіла толькі 8 двароў. Плошча калгасу складала ўсяго 70 гэкт. зямлі былога панскага маёнтку.

Зараз у нашым калгасе ёсьць моцнае ядро з 36 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Цяперашняя плошча калгасу — 567 гэкт. Перад пачаткам палявых работ калгасьнікі пастанавілі за лік занятых папароў і цаліны пашырыць пасеўную плошчу ня менш, чым на 20 проц.

Аб посьпехах нашага калгасу сьведчыць наступнае. **Летась за добрае вядзеньне гаспадаркі калгас атрымаў на с.-г. выстаўцы прэмію—дыплём і двухкорпусны плуг.**

Уся рабочая і тавара-прадукцыйная жывёла ў калгасе імя 1-га Мая абагулена. Мы арганізавана выйшлі ў поле. Палявыя работы вядуцца з вялікім уздымам. **Увесь яравы клін ужо зааран і забаранаваны.** Зараз разгарнулася сяўба. Засеяна ўсяго 15 гэкт. яравых культур.

Каб хутчэй ажыцьцявіць плян веснавой сяўбы, калгасьнікі па ініцыятыве групы беднаты пастанавілі **адмовіцца ад выхадных дзён і ад сьвяткаваньня рэлігійных сьвят, пакуль ня будуть закончаны палявыя работы.**

У дзень міжнароднага пралетарскага сьвята калгасьнікі запэўняюць, што яны і ў далейшым будуць з гонарам насіць назву членаў калгасу імя 1-га Мая і пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі праводзіць усе мерапрыемствы па яго ўзмацненьні, гэтым самым узмоцняць калектывізацыю, дабіваючыся поўнай сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

ПРАЎЛЕНЬНЕ КАЛГАСУ.

Парычы-уперадзе

Сяўба ў Парыцкім раёне, Бабруйскай акругі, разгарнулася поўным тэмпам. На 27-га красавіка 24 калгасы раёну на плошчы 14.660 гэкт. (17,5 проц. агульнай плошчы раёну —13 проц. усіх гаспадарак раёну) у вогуле выканалі 52 проц. пляну веснавой сяўбы. Індывідуальны сэктар таксама разгарнуў палявыя работы і даў на гэтае-ж чысло 50 проц. пляну сяўбы.

На раёне ў цэлым ужо скончана сяўба яравое пшаніцы і яравога жыта.

Плян па ячмені выкананы па 80 проц., па аўсе—на 75 проц.

Такім чынам, Парыцкі раён ідзе ўперадзе ня толькі Бабруйскай акругі, але і пераважнай большасьці раёнаў усёй БССР.

Зараз па раёне арганізуюцца спэцыяльныя камісіі па праверцы выкананьня пляну сяўбы як калгасамі, так і індывідуальнікамі. Гэтыя камісіі абыдуць усе палі і маюць залачай прыняць рашучыя захады, каб не адзін кавалак яравога поля не застаўся незасеяным. Калі камісія выявіць, што тая ці іншая індывідуальная гаспадарка ня можа засеяць свайго вучастку з прычыны недахвату пягавай або рабочай сілы, дык ёй дапаможа бліжэйшы калгас.

Такі рашучы пералом дасягнуты ў Парыцкім раёне за апошнія 2 тыдні. Гэтаму, галоўным чынам, спрыяла тое, што райком партыі, прызнаўшы ўсе свае памылкі, узяўся за рашучае і хуткае іх выпраўленьне. Партыйная арганізацыя ўсьвядоміла неабходнасьць выправіць перагібы, дапушчаныя пры калектывізацыі, і асноўную ўвагу зьвярнуць на замацаваньне арганізаваных калгасаў і фарсаваньне падрыхтоўкі іх да сяўбы. Побач з гэтым належная ўвага ў апошні час была зьвернута і на падрыхтоўку да сяўбы індывідуальніка. І тут мелі месца скажэньні і перагібы пры адводзе яму яравога кліну. Але пад кіраўніцтвам раённых арганізацый гэтыя перагібы хутка выпраўляліся непасрэдна на мясцох. Тое, што індывідуальны сэктар сее амаль такім-жа тэмпам, як калгасы, зьяўляецца таксама вынікам таго, што плян сяўбы даведзен сельсаветамі да кожнага двара. Ва ўсім раёне да сяўбы не прыступілі 15 індывідуальных гаспадарак.

Пасьпяховы ход сяўбы ў калгасах зьяўляецца вынікам таго, што яны выйшлі ў поле добра арганізаванымі. Ва ўсіх калгасах былі складзены рабочыя пляны, рабочая сіла размеркавана па брыгадах, кожны калгасьнік загадзя ведаў, дзе і што ён павінен рабіць. Калгасы былі забясьпечаны цягавай сілай, кармамі, насеньнем на 100 проц. Яны поўнасьцю скарысталі выдзелены крэдыт

Працоўная дысцыпліна сярод калгасьнікаў на вышыні. Прадукцыйнасьць працы ў калгасах на 20 проц. вышэй, чым у індывідуальных гаспадарках. Сваёй арганізаванасьцю і бадзёрым настроем калгасьнікі заражаюць індывідуальнікаў. Устанавілася маўклівае спаборніцтва паміж сацыялістычным і індывідуальным сэктарам.

Значная работа праведзена ў раёне па аказаньні дапамогі бедняком—індывідуальнікам. Для гэтай мэты камітэты ўзаемадапамогі арганізавалі 13 прапгужавых арцеляй. Беднота поўнасьцю забясьпечана крэдытамі і насеўным матар'ялам. Камітэты ўзаемадапамогі, акрамя таго, узялі на сябе апрацоўку і засеў кулацкіх зямель у тых мясцох, дзе няма сельсаветаў.

У раёне добра праведзена кантрактацыя, што зьяўляецца вынікам шырокай растлумачальнай работы спэцыяльных брыгад, якія былі пасланы па ўсіх сельсаветах. Па калгасах плян кантрактацыі выкапан на 95 проц., па індывідуальным сэктары—на 71 проц.

Трэба, аднак, адзначыць наступны недахоп. Плян засеву культурных траў індывідуальнікамі ня будзе выкананы з тае прычыны, што райпаляводсаюз свачасова не адпускаў насеньня траў індывідуальнікам.

Брыгадзір «Зьвязды» Апякін.

Ударная брыгада жанчын на агародзе (Калгас «Расьсьвет Пераможца»)

Узорная праца калгасу „Селянін“

За дзесяць рабочых дзён калгас «Селянін» у Хойніцкім раёне, Гомельскай акругі, выканаў свой плян веснавой сяўбы на 59 проц. За гэты час калгасьнікамі заарана, забаранавана і засеяна 200 гэктараў яравых культур: 60 гэкт. аўсу, 59 гэкт. ячменю, 56 гэкт. вікі і г. д. Акрамя таго 144 гэкт. плошчы падрыхтавана ўжо для пасеву бульбы, ільну і проса, а таксама засеяна 17 гэкт. канюшыны.

Зараз калгас пачаў вывозіць гной пад бульбу і пачаў яе сеяць. Ён атрымаў заданьне засеяць 13 гэкт. аўсом суседняму калгасу, у якога не хапае цягавай сілы, а таксама абрабіць яравы клін тых сялян, якія адмовіліся засеяць цалкам свае вучасткі (каля 30 гэктараў).

Асноўная прычына такога вялізарнага посьпеху заключаецца ў тым працоўным энтузіязьме, які выклікала сярод калгаснае масы ўступленьне ў сацыялістычнае спаборніцтва перад пачаткам палявых работ з суседніх калгасам «Чырвонае Сьвітаньне». «Селянін» абавязаўся цалкам выканаць свой плян веснавой сяўбы на працягу 20-ці рабочых дзён. Паданьня вышэй выніві за дзесяць рабочых дзён гавораць аб тым, што гэты калгас знаходзіцца на шляху да выкананьня пляну сяўбы нават да тэрміну.

У сувязі з уступленьнем у сацспаборніцтва, калгас «Селянін» асноўную ўвагу ўдзяліў правільнай арганізацыі працы, поўнаму скарыстоўваньню рабочай і цягавай сілы. Гэта задача ўдала выканана таму, што працаздольнае праўленьне апіралася ў сваёй рабоце на калгасны актыў, які складаецца тут з 60-ці калгасьнікаў—беднякоў і сераднякоў. Калгасны актыў «Селяніна» працуе з выключнай адданасьцю справе будаўніцтва свайго калгасу, нясе на сябе ўсе цяжкасьці, упарта перамагаючы іх, бо ён вядзе за сабою ўсю калгасную масу.

У пачатку палявых работ з 35-ці брыгад аратых толькі адна абвясьціла сябе ўдарнай. Але паступова пачалі абвяшчаць сябе ўдарнымі і сапраўды працаваць паўдарнаму і апошнія 34 брыгады. Такім чынам, у калгасе «Селянін» не засталося ніводнага працаздольнага калгасьніка, які-б быў ударнікам. Гэтым і тлумачыцца бальшавіцкі тэмп работ у калгасе «Селянін», тэмп, якога да гэтага часу ня бачыла вакольнае сялянства.

Трэба дадаць, што гэты калгас арганізаваўся толькі позьняй восенню 1929 году. На сёнешні дзень ён яднае 137 гаспадарак—75 проц. усіх вёскі Валок. Гаспадарка мае 99 закупленых і абагуленых таварна-прадукцыйных кароў, 53 калоды пчол, 175 рабочых коняй, 2 ветракі - млыны, 2 кузьні, сталярную, шавецкую і кравецкую майстэрні. Ёсьць брыгада цесляроў, пчаляроў, па доглядзе за жывёлай. Уся рабочая сіла (апрача жаночай) скарыстана поўнасьцю.

Брыгадзір «Зьвязды» ПЯЧОНКА.

За пашырэньне пасеўнай плошчы індывідуальных гаспадарак

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Першыя весткі аб ходзе сяўбы ў паўднёвых раёнах БССР паказваюць некаторае адставаньне тэмпаў пасеву ў пасобных сялянскіх гаспадарках, што зьяўляецца вынікам недапушчальна няўважлівых адносін сельсаветаў і райвыканкомаў да арганізацыі сяўбы сярод індывідуальных сялянскіх гаспадарак і стварае пагрозу невыкананьня агульнага пляну пасеву яравых у 1930 годзе з пашырэньнем пасеўнай плошчы на 12,8 проц.

У сувязі з гэтым ЦВК і СНК БССР ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Прапанаваць акруговым, раённым, выканаўчым камітэтам і сельсаветам:

а) тэрмінова праверыць давядзеньне пляну пасеву да кожнай пасобнай сялянскай гаспадаркі і пільна сачыць за ходам пасеву з прыцягненьнем да гэтай справы шырокіх колаў савецкай грамадзкасьці і сельсаветаў;

б) праверыць забясьпечанасьць насеньнем, с.-г. інвэнтаром і рабочай цягавай сілай індывідуальных пасобных гаспадарак, якія выйшлі з калгасаў і тых гаспадарак, што не забясьпечаны сродкамі вытворчасьці, дапамагчы набыць у парадку крэдыту насеньне, с.-г. інвэнтар, зьвязваючы гэту дапамогу з абавязковым выкананьнем гэтымі гаспадаркамі веснавога пляну пасеву;

в) арганізаваць дапамогу з боку калгасаў, саўгасаў, якія скончаць сваю сяўбу, і камітэтаў узаемадапамогі тым малямоцным гаспадаркам, якія жадаюць, але ня маюць магчымасьці выканаць свой пасеўны плян. Дапамога гэта павінна быць галоўным чынам у прадастаўленьні рабочай цягавай сілы, інвэнтару і іншых сродкаў вытворчасьці;

г) праверыць выкананьне пастановы НКЗ СССР аб выдачы пасобным малямоцным гаспадаркам пазык са створаных насенных фондаў па лініі камітэтаў сялянскай узаемадапамогі з абавязацельствам выкананьня атрымаўшымі пазыкі пасеўнага пляну;

д) аддаючы ўсе перавагі калектыўным гаспадаркам пры зямляўпараднаваньні ў частцы наданьня лепшых і больш выгодных зямель калгасам, адначасова рашуча рэагаваць на выпадкі адводу ў яравым і папарным клінох асобным гаспадаркам, якія не ўвайшлі ў склад калгасаў, або выйшлі з яго зямель, няўжытковых, або зусім няпрыгодных для безадкладнага с.-г. скарыстаньня.

Пры адводзе зямель калгасам трэба забясьпечыць выхад у поле, да пасьцьбішча і да водапою і тым гаспадаркам, якія не ўвайшлі ў калгасы;

е) акрвыканкомам і райвыканкомам тэрмінова праверыць і вырашыць скаргі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на няправільны адвод зямлі;

ж) ужываючы захады да таго, каб кожная бядняцка-серадняцкая гаспадарка, якая засявае індывідуальна, ведала, што паводле закону аб с.-г. падатку на яе не накладаецца падатак за павялічэньне ў параўнаньні з леташняй плошчай пасеву, адначасна растлумачыць кожнай бядняцка-серадняцкай гаспадарцы, што калі яна бяз прычын, якія заслугоўваюць увагі, зьменшыць пасеўны плян, або зусім адмовіцца засяваць, дык падатак з гэтае гаспадаркі будзе спагнены па леташняй пасеўнай плошчы, а зямля, адведзеная ёй, павінна засявацца калгасамі ў карысьць апошніх.

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

29 красавіка 1930 г. г. Менск.

Калгас «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ». Работа на полі.

„Змагацца за выкананьне вялікай пяцігодкі“

КАСЬЦЮКОВІЧЫ, Магілеўскай акр. (Па тэлеграфу). **Калгас імя 1-га Мая** рапартуе партыі і пралетарскай грамадзкасьці:

Шляхам арганізацыі працы, увядзеньня норм выпрацоўкі і правільнай сыстэмы аплаты ў залежнасьці ад якасьці і колькасьці выкананай работы, прэміяваньня лепшых калгасьнікаў мы дабіліся значнага ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы. Сяўба ў нашым калгасе праходзіць з посьпехам. Усяго мы засяваем 243 гэктары. На сёнешні дзень плян сяўбы выкананы больш, чым на 30 проц. У прыватнасьці плян засеву бульбы выкананы на 37 проц., а грэчкі—на 110 проц.

Арганізаваная праца калгасьнікаў у полі, іх дысцыплінаванасьць служаць прыкладным узорам для вакольнага насельніцтва.

Калгас імя 1-га Мая спаборнічае з калгасам «Ільліч». 1-га мая нашы прадстаўнікі выяжджаюць у калгас «Ільліч», а прадстаўнікі апошняга да нас, каб праверыць, як выконваюцца ўсе пункты сацдагавору.

Калгасьнікі калектыву 1-га Мая, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, будуць змагацца за выкананьне вялікай пяцігодкі. Яны заяўляюць, што калі надыдзе час, дык усе калгасьнікі калгасу імя 1-га Мая, як адзін, выступяць на абарону савецкай краіны.

Няхай жыве Ленінскі ЦК УсеКП(б)!

ПРАЎЛЕНЬНЕ КАЛГАСУ.

За арганізацыю батракоў і беднаты, за ўзмацненьне саюзу з сярэднім сялянствам. За ліквідацыю кулацтва, як клясы, на падставе суцэльнай калектывізацыі

Лепшы ўдарнік

Ударнік заводу «Камунар» тав. АСОЎСКІ

Калгас „Рэвалюцыя“—уперадзе

У пачатку красавіка гэтага году калгас Цімкавіч у Капыльскім раёне, Менскай акругі, быў арганізован калгас «Рэвалюцыя». У гэты калгас уваходзяць беларускія сяляне, а таксама і яўрэі. Кулацтва і антысавецкі элемэнт пачалі распускаць чуткі, што калгас абавязкова разваліцца, бо «яўрэі ня змогуць пацавацца на зямлі».

Жыцьцё, аднак, паказала зусім адваротнае. Калгас дружна ўзяўся за работу і сяўбу праводзіць вельмі арганізавана. Калгас у справе сяўбы ідзе ўперадзе ненаэлектрызаванай вёскі. Ён перш-ня скончыць сяўбу. Зараз у гэты калгас падаюцца заявы з просьбай прыняць у ліку калгасьнікаў.

З. БЯДУЛЯ

ПЕРШАМАЙСКАЕ

Эскізы

I. Рэб Есіф і 1-ае Мая

Аб гэтым даведаўся Сроль, які заўсёды ў суботу гаварыў у сынагозе малітву за цара. Сроль расказаў рабіну — рэб Есіфу. Рабін пайшоў да станавога прыстава, тайком, позна ўвечары, каб ніхто з мястэчкоўцаў не пабачыў яго.

— У чым справа? — запытаўся прыстаў і выставіў на рабіна блакітныя вочы і рыжыя вусы.

— Справа ў тым, — шаптаў рабін,— што наша местачковая хэўра сіцылістаў заўтра, на 1-ае мая, ладзіць мітынг у лесе за прысадамі. Мой абавязак духоўніка паведаміць аб гэтым пана прыстава.

— Дзякую за адданасьць да нас, г. ан. да манарха, якога я тут у мястэчку Гнілаўцы прадстаўляю.

Прыстаў паважна пагладзіў вусы і паціснуў руку старога рабіна.

— Бог на небе, цар на зямлі, а пан прыстаў у нашым мястэчку — вось слушны, аб якія мы абапіраемся,—віцевата адказаў рабін і падрабязна расказаў прыставу ўсё тое, што дачуўся аб першамайскім мітынгу ў лесе.

* * *

Прысады Кацярынінскіх бяроз цягнуліся ад самага мястэчка на Вялейскі тракт. Тады, у 1905 годзе, гэтыя прысады былі як-бы паркам для гулянняў мястэчковай моладзі.

І вось раніцою на заўтра, пасьля сакрэтнай бяседы рабіна з прыставам, моладзь мястэчка Гнілаўкі, дзеці шаўцоў, краўцоў, кавалёў і інш. дробных рамесьнікаў, у адзіночку і парамі пацягнуліся ў прысады ў бок лесу.

Ад памяшканьня прыстава да самага лесу былі растаўлены «пікеты» — хлопцы-падросткі, якія ў выпадку чаго адзін аднаму свісьпуць. Гэта будзе сыгналам аб небясьпецы з боку паліцыі. Гэты сьвіст дойдзе аж да апошняга «пікету» на паляне, дзе адбываецца мітынг.

Ціха было каля памяшканьня прыстава. На дварэ шпацыравалі куры, а на ганку спакойна драмаў сабака прыстава — Барбос, перад якім, як людзі жартавалі, і рабін шапку здымаў, бо і Барбос быў прадстаўніком манарха.

* * *

Дакладчыкам на мітынгу быў адзін таварыш з Менску, які спэцыяльна прыехаў у Гнілаўку на Першамайскае сьвята. З трох бакоў паляны быў густы лес, а з чацьвертага боку — балота, утыканае сьцяжарнямі ад зімовых стагоў.

Каля 40 чал. моладзі было на паляне. Гаварылі між сабою ціха, аглядаліся на бакох — у глыбіню цэністага лесу.

Над палянай палыхаў чырвоны сьцяг.

Таварыш з Менску (ніхто яго прозьвішча ня ведаў) узышоў на павалены пень. Ён спакойна прыглядаўся да кожнага з групы моладзі, як-бы вывучаў сваю ласную аўдыторыю. Адкінуў правай рукою пасмы чорных валасоў з вачэй, і пачаў:

— Таварышы! Сягоньня першы дзень Мая! У гэты дзень пралетарыят усяго сьвету...

Але яшчэ ўначы прыстаў, вураднікі і стражнікі наладзілі засаду ў лесе. Яны са стрэльбамі ў руках кінуліся на паляну. Пачалася страляніна з абодвых бакоў, бо ў некаторых з местачковай моладзі былі рэвальверы. Многія ўцяклі ў лес, а некаторых з дзяўчат — на балота.

Аблава цягнулася цэлы дзень. Таварыш з Менску ўцёк разам з іншымі. Злавілі некалькі дзяўчат. Зьдзекваліся над імі.

Разам з прыставам радаваўся рэб Есіф, местачковы рабін...

Так прайшоў Першы дзень Мая ў 1905 годзе ў мястэчку Гнілаўцы.

II. Мы пераможам!

Вуліцы Вільні ў гэты дзень былі абрызганы сонцам. Шмат дэманстрантаў, і гучныя сьпевы інтэрнацыяналу. Жывой лавінай мітусіліся вуліцы — некалькі дзесяткаў тысяч працоўных. Бурлівы тлум народу плыў ад Кялікай вуліцы праз Нямецкую на вуліцу Адама Міцкевіча. Ад Адама Міцкевіча да Лукішак, дзе муры з кратамі на маленькіх вакэнцах адлюстроўваюцца ў срыбры Вільні скуль сотні вязьняў прыслухоўваюцца да заклуванага Першамайскага гуду.

На тратуарах — шпікі, паны, жандармэрыя і мяшчане. На бальконах у вокнах — тыя самыя. Яны аблепліваюць фасады аблупленых дамоў запушчанага старога гораду. З ненавісьцю глядзяць у гарачыя вочы дэманстрантаў, у іх энэргічныя напружаныя профілі.

— Во пся крэў! На божа цыла гэтулькі народу ня было на вуліцы!

Так сьлюняніць сваёй жонцы адзін пан на вуха.

А вось конная жандармэрыя ўварвалася ў дэманстрацыю.

Крыкі, лаянкі, стрэлы.

Мітусяцца людзі.

З тратуараў таўкуцца ў брамы.

З вакон і бальконаў хаваюцца ў глыб дамоў.

На тратуарах — шпікі і паліцыя. На вуліцы — дэманстранты і коньніца.

А спераду чырвоны сьцяг над галовамі ірдзее, соўваецца далей і далей, бліжэй да Лукішак...

Нехта ў капэлюху забег наперад, стаў насупроць чырвонага сьцягу, прыцэліўся.

І чырвоны сьцяг схаваўся ў натоўпу. Конная і пешая жандармэрыя, шпікі і ў капэлюхох зьмяшаліся з дэманстрантамі. Каша з жывых людзей, крыкі, агідныя лаянкі. Рукі і ногі — ў жудасных клубкі.

Не ўдалося дэманстрантам выратаваць цяжка параненага таварыша, які нёс перад імі чырвоны сьцяг. Яго павалаклі жандары. Крывавы сьлед пягнуўся за ім па бруку.

* * *

Пры допыце ён ляжаў на цьвёрдай лаве, сядзець ня мог. Над ім нагіваліся жандары.

— Тваё прозьвішча?

— Дзе жывеш?

— Дзе працуеш?

— Хто галоўныя арганізатары?

— Хто адозвы па горадзе расклейваў?

— Дзе іх друкавалі?

Пытаньні сыпаліся на яго з усіх бакоў нібы град.

Штурхалі яго, тармашылі.

— Кажы пся косьць! Большэвік!

Ён маўчаў. Правую руку прыціснуў да грудзей, — да прастрэленага месца, дзе вопратка была вільготная і клейкая...

Твар быў зялёнавата - бледны, а вочы — залацістыя, углыбленыя — глядзелі перад сабою і як бы нікога ня бачылі.

Ні на адно запытаньне не адказаў.

Дыхаў цяжка. Ноздры расшыраліся. Успацеў лоб.

А вось з яго вуснаў пачуўся шэпт. Жандары падсунулі смаглыя валасатыя вушы.

... Ганей цар расстрэльваў, цяпер паны тое самае робяць. Але мы пераможам! Пера-мо-жам...

Вочы засталіся затуманеныя, шкляныя.

І ў затхлым паветры змрочнай каморы, як-бы яшчэ чуваць быў над трупам забітага водгалас шэптаў:

— Пе-ра-мо-жам!..

III. Праз вакно нэйтральнага прафэсара

Ды ці гэты дзень можа быць бяз сонца, бяз музыкі і сьпеваў.

А вокны прафэсарскай кватэры на Савецкай вул. зачынены. Першамайскі вулічны гуд урываецца ў гэтыя пакоі заглушаны, нібы гукі грамафона. Аддалены тупат чырвонай кавалерыі, урыўкі духовага аркестру, сьпевы.

Прафэсар ляжыць на канапе і чытае «Критику отвлеченных начал» В. Салаўёва. Яго жонка сядзіць ля піяніна і найгрывае Шопэна. Мэлянхалічныя гукі запаўняюць пакой.

А да вакна прыціснуўся іх сынок — дванаццацігадовы Мішка.

Ён ня можа адарвацца ад халаднаватага шкла.

— Пусьці, папачка, на вуліцу...

Бацька ўглыбіўся ў кнігу і ня чуе.

Прафэсар ня хоча, каб яго родны сын набраўся вулічных уплываў.

«... Ня то, каб я быў супроць улады, не! Заношта? — Я зарабляю да 700 руб. у месяц. Няма за што варожа да «іх» адносіцца. Наадварот — я калісьці сам быў рэвалюцыянэрам. Як быў студэнтам, быў супроць самадзяржаўя, нават прымаў удзел у адной дэманстрацыі. Але я ўяўляў сабе рэвалюцыю зусім па-інакшаму, бяз гэтай жорсткасьці, без палзелу людзей на такіх і гэтакіх. А хто-ж гаспадарыць цяпер? — някультурныя людзі, хамы.

— Папачка, я на адну хвіліну выйду...

Да Мішкі прыходзіць настаўнік французкай мовы, настаўнік нямецкай і расійскай мовы і настаўніца музыкі. Мішка вучыцца ў хаце.

Ня варта быць разам з цэлым «калгалам» дзяцей у школе—адзічэе там...»

Мішка ўгледзеў праз вакно гарнавал —пярэсты, рознакалёровы і вясёлы...

— Папачка, я іду...

— Міша! — грымнуў бацька моцным голасам.

Хлопчык застыў на месцы, так, як на прыціснуўся да вакна, ажно ён распляснуўся і лоб забалеў.

Розныя сьцягі, дзесяткі, сотні мітусяцца ўніз па Савецкай. Мішка пільна прыглядаецца з 3-га паверху. Вось ідуць фізкультурнікі. А вось дзеці... Дойдзе доўгія калёны...

У Мішкі сэрца ные з запаўзрасьцю... вачох сьлёзы.

Бацька адкінуў Салаўёва. Адной рукой гладзіць лысіну, другой — круглы жывот. Вочы наставіў у бок піяніна на патыліцу жонкі. Ён зусім ня бачыць жонкі і ня чуе яе музыкі — ён думае:

... Яшчэ не наладзіўся той, хто будзе кіраваць маімі думкамі і перакананьнямі.

Шум вуліцы даходзіць да яго.

... Аднак! Сьвяткуюць-жа вось! Увесь Менск вышаў на 1-ае мая! А я наладжу сабе сьвята, калі сам захачу. Ня люблю трафарэты.

— Папка...

— Што?

— Цяпер напэўна на Пляцу Волі прамовы гаворацца. Я пастаўлю на месцы гучнагаварыцель...

— Ня трэба, — заўецца бацька, — не дазволю!

Мішка ўткнуўся тварам у маміну сьпіну і горка заплакаў.

А Менск сьвяткаваў 1-ае мая.

Разам з дарослымі прымалі ўдзел у сьвяткаваньні і тысячы малых Мішкаў.

Лепшы ўдарнік

Ударнік заводу «Камунар» т. КІСЯЛЕЎ

АД'ЯЖДЖАЮЧЫ Ў ВОДПУСК
у дом АДПАЧЫНКУ, на КУРОРТ,
атрымлівайце газ. „ЗЬВЯЗДА“
па месцы знаходжаньня ў водпуску,
паведаміўшы ў аддзел падпіскі газ. «ЗЬВЯЗДА»
ВАШ НОВЫ АДРАС.
Газэта будзе дасылацца па новым адрасе
без асобнай даплаты.

Хто ў першых радох барацьбітоў за пяцігодку

„КАМУНАР“ УПЕРАДЗЕ „ЭНЭРГІІ“

КАМУНАРАЎЦЫ ПАКАЗВАЮЦЬ УСІМ УЗОР КАМУНІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ „ЭНЭРГІІ“ ПАВІННЫ УЗЯЦЬ ПРЫКЛАД З КАМУНАРАЎЦАЎ

Разам з „Камунарам“ нага ў нагу---да выкананьня і перавыкананьня прамфінплянаў



8-га сьнежня ў жыцьці двух заводаў —«Камунара» і «Энэргіі» — адбылася падзея, якая цесна зьвязала лёс гэтых двух заводаў моцнымі ўзаемнымі абавязацельствамі. У гэты дзень два калектывы — паўтары тысячы пралетараў —падпісалі дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва.

З таго славутага дня прайшло пяць месяцаў.

Пяць месяцаў у жыцьці заводу—тэрмін вялікі. За пяць месяцаў завод часамі так мяняе свой выгляд, што свойжа рабочы, вярнуўшыся з камандыроўкі на кароткатэрміновыя курсы, не пазнае карпусоў і цэхаў. Такі тэмп нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Шмат зьмянілася на «Камунары» і «Энэргіі». Новыя карпусы, новыя цэхі, новыя людзі. Яшчэ каля 500 новых рабочых улілося ў гушчару старых пралетараў і растала ў масе. Яшчэ дзесяткі варштатаў адаявалі сабе месца на тэрыторыі заводаў. Расьлі заводы, расьлі калёнкі лічбаў адгружанай прадукцыі.

* * *

Лічбы, лічбы і лічбы.
У лічбах пяцігодкі — **наша будучае.**
У лічбах прамфінплянаў — **заўтра** рабочае клясы.
Вось рамантыка нашых дзён!

ВЫТВОРЧАЯ ПРАГРАМА.

«Камунар».
Першы квартал — 98,7 проц.
Другі квартал — 108,8 проц.
За паўгодзьдзе — **104,3 проц.**

«Энэргія».
Першы квартал — 86,9 проц.
Другі квартал — 102,9 проц.
За паўгодзьдзе — **94,9 проц.**

Удумайцеся ў гэтыя лічбы. Як шмат яны гавораць аб тэмпах, якія нарастаюць з кожным днём, аб людзях, якія ўпар та б'юцца над кожным процантам павышэньня вытворчай праграмы.

РОСТ ПРАДУКЦЫІ

Першае паўгодзьдзе бягучага году, у параўнаньні з першым паўгодзьдзем мінулага году, дало рост прадукцыі:
у заводзе **«Камунар»** на 253,5 проц.,
у заводзе **«Энэргія»** на 308,9 проц.

Гэта значыць, што завод «Камунар» выпрацаваў прадукцыі за гэта паўгодзьдзе больш чым за мінулае **ў два з паловаю разы**, а завод «Энэргія» больш як **у тры разы.**

ЗЬНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ

Завод **«Камунар»** узяў на сябе абавязак зьнізіць сабекошт прадукцыі на 27 проц. (замест 26 паводле пляну).

Завод **«Энэргія»** — на 17 проц. (замест 16,6 проц. паводле пляну).

За пяць месяцаў завод **«Камунар»** зьнізіў сабекошт на 29,43 проц., завод **«Энэргія»** — на 5,96 проц.

Завод **«Камунар»** мае, дзякуючы гэтаму, эканомію **ў 276.441 руб.**
«Энэргія» — 39.044 руб.

ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ

Рабочыя **«Камунара»** павялічылі прадукцыйнасьць працы на 35,7 проц. замест 35 проц., паводле сацдагавору.

Рабочыя **«Энэргіі»** — на 26,85 проц., замест 28,4 проц.

БРАК.

«Камунар» абавязаўся зьнізіць брак на 50 проц. Паводле пляну страты з прычыны браку павінны былі скласьці за паўгодзьдзе 14.037 руб. Завод «Камунар» зьнізіў брак на **71,7 проц.** і таму меў страты толькі 4.150 руб.

«Энэргія»-ж абавязалася зьменшыць брак «да мінімуму». Плян прадугледжваў брак максымум на 5.516 руб. Фактычна-ж брак каштаваў заводу 11.206 руб.

ПРАГУЛЫ.

Абодва заводы абавязаліся зьнізіць прагулы да 0,02 проц.

«Камунар» зьнізіў прагулы з 0,66 проц. да 0,32 проц.

«Энэргія» ПАВЫСІЛА прагулы з 0,52 да 1,05 проц.

На «Камунары» было за паўгодзьдзе 287 прагульных дзён (на 600 рабочых).
На «Энэргіі» — 1795 прагульных дзён (на 780 рабочых).

ПАРУШЭНЬНІ ПРАЦДЫСЦЫПЛІНЫ

Камунар» — 63 выпадкі (уключаючы два спазьненьні).
«Энэргія» — 706 выпадкаў (уключаючы **579** спазьненьняў).

* * *

Колькі пунктаў — столькі ўдараў на заводзе «Энэргія». «Камунар» па ўсіх паказальніках ідзе далёка ўперадзе. «Камунар» ня толькі выконвае пляновыя заданьні, ён іх **перавышае,** ня толькі выконвае сацдагавор, але і **перавыканаў яго.** «Камунар» з гонарам вядзе сацспаборніцтва, пакідаючы свайго таварыша далёка ззаду.

Трэба, аднак, зрабіць невялікую, але важную агаворку. Лічбы зьніжэньня сабекошту па заводзе «Камунар» датычаць выключна параўнаўчай прадукцыі, г. зн. прадукцыі, якая рабілася ў мінулым годзе. Гэта частка прадукцыі складае процантаў 60 усей прадукцыі заводу. Рэшта — 40 проц. — складае новую вытворчасьць, якую не магчыма параўнаць з мінулагодняй (таму, што яе тады ня было).

Гэта акалічнасьць уносіць некаторыя зьмены ў лічбы зьніжэньня сабекошту, яна іх некалькі **зьмяншае.**

Вялікая недакладнасьць таксама ўкралася пры зацьвярджэньні прамфінпляну заводу «Камунар» Мэталятрэстам. Зьніжэньне сабекошту па ўсёй прадукцыі не адпавядала зьніжэньню сабекошту па асобных прадметах выпрацоўкі. Трэст зацьвердзіў калькуляцыю сабекошту паасобных прадметаў, якія робіць завод «Камунар», але ня вывеў з гэтых лічбаў сярэднягa зьніжэньня сабекошту па заводах, (што склала-б 33 проц.).

У выніку: плянавае заданьне трэсту (26 проц.) завод перавыканаў, але калькуляцыйных моркаваньняў на асобныя прадметы, г. зн. патрабуемага сабекошту на асобныя прадметы выпрацоўкі, **не дасягнуў.**

Ударнік кацельнага цэху заводу «Энэргія» т. СОС.

Для нагляднасьці — некалькі прыкладаў.

Сьвідравальны варштат у мінулым годзе каштаваў 34 руб. 21 кап., павінен быў каштаваць у гэтым годзе 22 руб. 96 кап., фактычна ён каштуе 29 руб. 07 кап.

Варштат «Сьмірнова» каштаваў 142 руб. 32 к., павінен быў каштаваць 126 руб. 81 к., фактычна каштуе 134 руб. 02 кап.

Ціскі (48 кілёграмаў) каштавалі 56 руб. 65 кап., павінны былі каштаваць 35 руб. 52 кап., фактычна каштуюць 40 руб. 20 кап. і г. д.

Толькі па двух прадметах (малых ціскох і цэбрах) «Камунар» перавыканаў заданьне на сабекошце.

Гэта памылка трэсту і маўчаньне заводакіраўніцтва некалькі **дэзарыентавалі** рабочую грамадзкасьць, якая ўважліва сочыць за спаборніцтвам «Камунара» і «Энэргіі». Некаторае заспакаеньне гэта ўнесла і ў асяродзішча рабочых «Камунару». Сярод работнікаў «Камунару» атрымалася некаторае «головокружение от успехов». Гэта прывяло да **дэмабілізацыі** ўвагі рабочых на выкананьне аспоўнага заданьня—дасягненьня сабекошту прадукцыі **па цэнах,** якія ўстаноўлены самім заводакіраўніцвам і зацьверджаны трэстам.

Гэта — вялікая памылка як заводакіраўніцтва, так і трэсту, які ні разу за першае паўгодзьдзе ня даў патрэбнага паказаньня і, нават, у сваім апошнім кан'юнктурным агляде не палічыў патрэбным паддаць крытыцы лічбы заводакіраўніцтва «Камунара».

* * *

Але, калі, нават, улічыць зробленую памылку і скінуць з рахункаў «Камунара» няправільна налічаны прыбытак, дасягненьні «Камунара», у параўнаньні з дасягненьнямі «Энэргіі», **бясспрэчны.** «Камунар» усё-ж ідзе ўперадзе «Энэргіі», паказваючы ўсім прыклад камуністычнай працы.

Чым-жа тлумачыць посьпехі «Камунара» і паражэньні «Энэргіі»?

Посьпехі «Камунара» — **у лепшай арганізацыі працы, у большай працдысцыпліне, у лепшым кіраўніцтве «трыкутніка».**

Паражэньні «Энэргіі» — **у горшай арганізацыі працы, слабой працдысцыпліне, горшым кіраўніцтве «трыкутніка».**

Падамо некалькі прыкладаў.

* * *

Завод **«Камунар»** мае плян рацыяналізацыі з 71 пункту, а завод **«Энэргія»** нават слабога пляну рацыяналізацыі не паклапаціўся скласьці.

Толькі частковае ажыцьцяўленьне пляну рацыяналізацыі дало заводу «Камунар» за першае паўгодзьдзе 30 тысяч рублёў эканоміі, а ажыцьцяўленьне ўсяго пляну за ўвесь год дасьць 130 тысяч рублёў пры затраце **2.817 руб.**

Рабочыя заводу **«Камунар»** за лепшыя прапановы ўзнагароджаюцца прэміямі, якія даходзяць аж да 300 руб. За першае паўгодзьдзе выдана прэмій на 1.280 руб.

Рабочыя заводу **«Энэргія»** ня толькі не прэміруюцца за лепшыя прапановы, хаця фонд прэміяваньня складае звыш 7.500 руб., але іх прапановы, як правіла, **ня выконваюцца.**

Дырэктару заводу **«Энэргія»** толькі «здаецца», што нехта нешта атрымаў. А на заводзе **«Камунар»** аб гэтым ведае кожны рабочы. Ведае ня толькі аб тым **хто** атрымаў, але і **колькі** атрымаў, і **за што** атрымаў. І гэта зацікаўлівае рабочага пытаньнямі рацыяналізацыі.

На **«Камунары»** ёсьць два тэхнічныя гурткі па падняцьці кваліфікацыі рабочых, якія яднаюць 65 чалавек. Акрамя таго, ёсьць тэхнічная кансультацыя, якая дзяжурыць рэгулярна па вечарох.

На заводзе **«Энэргія»** ёсьць толькі адзін тэхнічны гурток з 20-ці чалавек.

На **«Камунары»** масавая работа пастаўлена значна лепш. Агульныя сходы падрыхтоўваюцца. Аб парадку дня агульнага сходу наладжваюцца спэцыяльныя гутаркі ў цэхах. У выніку — наведваньне сходаў 90—95 проц., даходзіць і да 100. Актыўныя выступленьні.

На **«Энэргіі»** — сходы не падрыхтоўваюцца. Наведваньне — нізкае. Былі нават выпадкі зрыву сходаў. Актыўнасьць невыстарчальная.

Наведваньне справаздачных сходаў у часе перавыбараў заўкому: на **«Камунары»**—85,9 проц., на **«Энэргіі»**—76 проц. Выступленьняў на сходах было: на **«Камунары»** — 81, што складае 18 проц. прысутных, на **«Энэргіі»**—48, што складае 11,1 проц. прысутных. У пранерцы работы заўкому прымала ўдзел: на **«Камунары»** 78 чалавек, на **«Энэргіі»** — 45.

Месяца два з паловай таму назад у кавальскім цэху заводу **«Камунар»** выявіўся прарыў у выкананьні прамфінпляну. У цэху мелі месца вялікія прагулы, былі выпадкі сымуляньні. Заўком адразу-ж вылучыў тройку для праверкі прычын прагулаў, некалькі разоў ставіў пытаньне на вытворчай нарадзе, правёў рад гутарак з рабочымі і з майстрамі, арганізаваў паказальны суд над сымулянтам. У выніку — прарыў ліквідаваны.

На **«Энэргіі»** стары склад заўкому бязьдзейнічаў. Надзвычайныя прагулы не прыцягнулі яго ўвагі. Рабочыя заводу ня былі мабілізаваны на барацьбу з прагуламі.

* * *

Але ёсьць недахопы, якія маюць месца на **абодвух заводах.**

Асноўны недахоп, які можа сарваць усе дасягненьні — **адсутнасьць унутрызаводзкага сацспаборніцтва.** На абодвух заводах ёсьць ударнікі, ударныя брыгады, ёсьць нават ударныя цэхі Але сацспаборніцтва паміж ударнікамі, брыгадамі, цэхамі — **не арганізавана.** Ёсьць дагавары асобных брыгад з адміністрацыяй. Але спаборніцтва **паміж брыгадамі няма.**

НЯМА АСНОЎНАГА!

На **«Камунары»** кавальскі цэх выклікаў на спаборніцтва бляшаны, ліцейны выклікаў такарны. Але ўсе чатыры цэхі абмежаваліся гучнымі фразамі.

На **«Энэргіі»** ў ленінскія дні вагавы цэх выклікаў на спаборніцтва ліцейны цэх Але і тут справа абмежавалася парадным выступленьнем.

Дасягненьні **«Камунара»** былі-б значна большымі, прарывы **«Энэргіі»** — значна меншымі, калі б **заўкомы** падхапілі ініцыятыву мас і дапамаглі ім аформіць сацспаборніцтва, далі-б канкрэтны зьмест фармальным выклікам.

Другі немалаважны недахоп: **прамфінплян не даведзены да кожнага рабочага.**

І нарэшце, трэці буйны недахоп: **паміж заводамі «Камунар» і «Энэргія» няма абмену вопытам**—вытворчай, партыйнай і прафэсыянальнай работы.

Ганьба для абодвых заўкомаў, што за ўвесь час спаборніцтва нават старшыні заўкомаў не паведалі адзін другога.

* * *

Так спаборнічаюць два заводы **«Камунар»** і **«Энэргія».**

У першага рад вялікіх посьпехаў, рад буйных перамог. У другога — значнае адставаньне, шмат недахопаў.

Рабочыя «Энэргіі» павінны ўзяць прыклад з камунараўцаў. Дагавор аб сацспаборніцтве абавязвае. Другая та давіна сацспаборніцтва, якая пачынаецца сёньня, павінна быць пераломным момантам у жыцьці «Энэргіі». **Выраўняць фронт!** Разам з «Камунарам»—нага ў нагу — да выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну!

ПРАЎДЗІН.

Лепшая ўдарніца мэханічнага цэху зав. «Энэргія» сьлесар тав. ЦЯСЬЛЁНАК

Лепшы ўдарнік ліцэйнага цэху заводу «Энэргія» т. АЛЬПЕРЫН

Новая швэйная фабрыка імя Дзяржынскага

(АД НАШАГА БАБРУЙСКАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

2-га мая ўрачыста адкрываецца буйная швэйная фабрыка імя Дзяржынскага. Новае сацыялістычнае прадпрыемства ўступае ў строй прамысловасьці Бабруйшчыны.

Фабрыка адкрываецца афіцыяльна 2-га мая, але працуе яна ўжо з сакавіка г. г.

Усё разьлічана, усё мэханізавана на новай фабрыцы. З 7-мі гадзін раніцы да гадзіны ночы не змаўкае грукат машын. Фабрыка працуе на дзьве зьмены, на бесьперапынным рабочым тыдні.

Мэханізацыя дае аб сабе ведаць на кожным кроку. Машына ража матар'ялы, машына робіць петлі, машына ўстаўляе гузікі, машына гладзіць гатовую прадукцыю. На фабрыцы папуе поўнае падзяленьне працы .Пара штаноў праходзіць па канвэеры 84 апэрацыі, прагумленае паліто—80 апэрацый.

Кожную гадзіну фабрыка выпускае 170 пар штаноў і 53 прагумленыя польты.

На фабрыцы працуе каля 1.000 рабочых. Сюды перакінуты рабочыя з раду працкалектываў гарадоў БССР.

60 проц. швэйнікаў фабрыкі імя Дзяржынскага—жанчыны.

Лёзунг дзяржынцаў: **перавыканаць прамфінплян, выканаць пяцігодку за чатыры гады.** Выконваючы гэты лёзунг, дзяржынцы разгортваюць сацыялістычнае спаборніцтва паміж цэхамі, зьменамі, агрэгатамі і групамі. Першы агрэгат мае 116 ударнікаў, другі—58.

На фабрыцы 70 членаў партыі і каля 200 камсамольцаў. Гэта—касьцяк фабрыкі, які мабілізуе масы швэйнікаў на баруцьбу за перавыкананьне прамфінпляну.

З мая фабрыка запрацуе поўным тэмпам на ўсе тры агрэгаты.

Швэйная фабрыка імя Дзяржынскага—каштоўны ўклад у сацыялістычную прамысловасьць—гэта лепшы паказальнік нашага пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва. Маюць рацыю рабочыя-дзяржынцы, якія ў першым нумары сваёй друкаванай газэты «Чырвоны швэйнік», заяўляюць:

«Пуск швэйнай фабрыкі імя Дзяржынскага—наш першамайскі падарунак сусьветнаму пралетарыяту».

А. МАГІДАЎ.

БАБРУЙСК, ШВЭЙНАЙ ФАБРЫЦЫ ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА

Шчырае прывітаньне швэйнікам і ўсяму пралетарыяту Бабруйшчыны ў дзень урачыстага пуску швэйнай фабрыкі — новай перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.



Пашывачны цэх новай швэйнай фабрыкі ім. Дзяржынскага ў Бабруйску

Не кравец-адзіночка, а швэйнік-ударнік

Яшчэ год таму назад на гэтым месцы быў пустыр, дзе куруўся адзінокі дымок вайсковай хлебапякарні. Рады падсьлепаватых хацінак гарадзкой акраіны дашаўнялі малюнак.

Гэта — у мінулым. Цяпер тут раскінулася сваім двухпавярховым будынкам, з прасторнымі, вясёлымі вокнамі Менская швэйная фабрыка «Кастрычнік». Праз год—два тут узрасьце яшчэ новы 130-мэтровы корпус, а будынак фабрыкі будзе мець выгляд вялізарнай літары «Ш». Тут жа будзе набудавана футравая фабрыка — падсобнае прадпрыемства швэйнай. Чатыры з паловай тысячы рабочых — вось кадры будучага швэйнага гіганта. Па дзесятках канвэерных астужак тут будуць «цячы» сотні тысяч гатовых польтаў.

Можна і трэба марыць аб будучыне фабрыкі, але-ж і яе сучаснасьць заслугоўвае ўвагі. 1.700 рабочых — гэта ўжо сёнешні факт. З іх каля 500 партыйцаў і камсамольцаў. Ленінскія дні далі 200 новых заяў у партыю. Электрыфікацыя і канвэерызацыя вытворчага працэсу, шырокі ўдарніцкі рух, вытворчыя камуны — гэта таксама сёнешні факт. І што самае галоўнае, ужо сёньня няма больш згорбленага, сухотнага з ніткаю на зубе і сантымэтрам на шыі, забітага шаўца-адзіночкі, а ёсьць індустрыяльны пралетар — швэйнік-ударнік. Сацыялістычная швэйная фабрыка выпрацоўвае ня толькі польты і гарнітуры з мёртвай матэрыі, — яна фармуе і перавыкоўвае жывую чалавечую матэрыю — новых рабочых з учарайшых самутужнікаў і сялян-індывідуалістых. Сотні працоўнай моладзі, якія, пры іншых умовах, былі-б толькі «падручнымі хлопчыкамі» ў майстра-гаспадара, сёньня, ў абставінах буйной індустрыяльнай фабрыкі, вырастаюць у загартаваных пралетараў.

Якая вялікая розьніца паміж гэтым новым швэйнікам пралетарам і старым саматужнікам краўцом! Вось рабочыя фабрыкі праз свой асьпіранцкі гурток зьвярнуліся з лістом да амэрыканскіх і бэльгійскіх рабочых краўцоў, вітаючы з баявым пралетарскім сьвятам 1-га мая. Гэта было зусім недаступна і незразумела былым распыленым і абмежаваным саматужнікам.

Ня трэба думаць, быццам тут на фабрыцы ўжо скончана барацьба паміж былым краўцом-саматужнікам і рабочым сацыялістычнага прадпрыемства. Факты гэтае барацьбы нагледваюцца кожны дзень. Але кожны дзень прыносіць усё больш і больш доваду, што рэшткі цэхаўшчыны, індывідуалізму перамолваюцца ў электрычнай машыне, выціскаюцца псыхалёгіяй новага рабочага-ударніка і энтузістага сацыялістычнага спаборніцтва.

Калі вы хочаце зразумець, у якіх умовах стварэцца швэйнік - ударнік, новы сьвідомы рабочы, дык пабывайце на фабрыцы і пазазірайце за вытворчым працэсам.

Вось вы ўзыходзіце на другі паверх фабрыкі, туды, дзе пачынаецца вытворчы працэс. Заходзіце ў дэкатыровачную, дзе сукно пасьля пары і пракаткі набывае гладкі выгляд. А вось яно рознакаляровымі тоўстымі чатырохкутнікамі (па 12 і 25 камплектаў польтаў, гледзячы па матар'ялу) ляжыць на шырокіх сталох закройнай. Зьверху — кусок сукна размаляваны хітрымі, як у рэбусе, крэйдавымі рыскамі. Гэта — стандарт раскрою. Хвіліна, і спрытная рука рэзчыка, узброеная электрычным нажом, бегае па гэтых рысках, вырабляючы тонкія зыгзагі. Вы яшчэ не пасьпелі дайсьці да канца залі, як на сталох замест сукна ўжо ўзвышаюцца груды кавалкаў і кавалачкаў. Гэта дэталі будучага жаночага паліта. Адсюль, з закройнай, горы гэтых кавалкаў, узброеныя кожны сваім нумарам, пойдуць на істужку.

Вось вы ўваходзіце ў залю, дзе з хаосу кавалкаў стварэцца польты. Спачатку вы бачыце толькі стракатае мора матэрый — сукна і падкладкі. Потым вы заўважаеце тры рады ва ўсю даўжыню залі, якія складаюцца з швэйных электрыфікаваных машын, гофманскіх прасаў, электрычных уцюгаў. Па абодвух бакох кожнага раду сядзяць людзі, якія зусім не нагадваюць звычайнага вобразу шаўца. Гэта тры канвэерныя істужкі, або тры агрэгаты. Вы чуеце прыдушаны шум матораў і швэйных машын, бразганьне педаляй і ўздыхі пары гофманскіх прасаў. Людзі, што сядзяць 6-ма радамі ўздоўж трох істужак, цалкам захоплены сваёй працай. Іх рукі выробляюць самыя рознастайныя рухі. Твары сур'ёзныя, але бадзёрыя.

Але дзе-ж робіцца паліто? А вось яно пачынаецца ў апэрацыі № 1. Першы поў — першыя 60 сэкунд. Вось бясформеная матэрыя замітусілася па руках людзей, што сядзяць радамі. Кожнаму з іх дана па 60 сэкунд на сваю апэрацыю. 158 апэрацый, 158 мінут, 158 чал. —і паліто гатова. У канцы залі 1-га паверху вы ўжо можаце наглядзець яго верх. Вось кантралёр спрытна ўскінуў яго на манэкэн і вокам доктара сочыць за кожнай дробязьзю. Годнае — на трубе спускаецца ўніз далей на істужку. З дэфэктам застаецца тут, г. зн. патрэбна пераробка.

Унізе такія-ж тры істужкі і такія-ж 6 радоў людзей і машын — тры агрэгаты. Гэта працяг верхніх. Тут ужо паліто набывае свой канчатковы выгляд —ад падкладкі да апошняга гузіка. Вы знойдзеце тут малюнкі, якія нагадваюць магазын гатовага адзеньня. На вешалках вісяць гатовыя польты розных колераў і фасонаў. Расцэньшчык замыкае істужку, прымадоўваючы да кожнага паліта ярлык з вызначэньнем цаны і сорту.

3.000 польтаў за дзень! На 7 мільёнаў прадукцыі за паўгода — вось простая арыфмэтыка масавай швэйнай вытворчасьці. Ці ня праўда, аналёгіі з майстэрняй вашага знаёмага шаўца тут будзе ня месца. Але ня трэба думаць, што людзі, якія так спрытна і хутка шыюць тысячы польтаў за дзень робяць гэта з такой-жа лёгкасьцю, як апісана. Не. Ім таксама знаёмы і няўдачы і прарывы, барацьба з прагуламі, з нядбайнасьцю да вытворчасьці. З гэтымі адмоўнымі зьявішчамі яны змагаюцца мэтадамі ўдарніцтва, сацспаборніцтва, стварэньнем камун і калектываў.

Яшчэ ня так даўно, у студзені гэтага году, фабрыка мела шырокі прарыў, які складаў 23 проц. недавыкананьня прамфінпляну. Увесь рабочы калектыў, пачынаючы ад прыбральшчыцы да дырэктара фабрыкі, адчуваў сябе ў гэты час ня зусім добра. Прадумалі сур'ёзна становішча. Пачалі падцягвацца.

— Колькі-ж яшчэ засталося нам, каб пакрыць ганебны прарыў?

Такімі словамі сустракалі рабочыя адміністрацыю ў лютым і ў сакавіку. Напружвалі энэргію, адваёўваючы процант за процантам. Партыйным і камсамольскім калектывам прышлося папрацаваць, як належыць. Камсамольцы выступілі пачынальнікамі ў стварэньні камун. Бюро парткалектыву дапамагло афармленьню камун, склікаўшы тры рады камунараў. Ударнікі пайшлі ўперадзе барацьбы за ліквідацыю прарываў. Вось перад намі сухі, але вельмі цікавы сьпіс, вложаны брыгадай па праверцы складу ўдарнікаў. Сьпіс заключае ў сябе некалькі дзесяткаў прозьвішчаў з такімі скупымі адзначэньнямі:

— Жэлігоўскі, таб. № 977 — у газэту, як добры ўдарнік.

— Райк, таб. № 380 — у газэту, як добрая ўдарніца.

— Пэўэнэр, таб № 1292, камунарка— у газэту, як вытрыманая ўдарніца і за добрую якасьць.

Гэты сьпіс лепшых і перадавых можна было-б прадоўжыць. Сярод іх ёсьць рад такіх, якія намячаюцца да ўзорнай работы, да прэміраваньня. Але ёсьць у ім і ўдарнікі з мінусам. Супроць іх зусім другія адзначэньні:

— Серабранскі (былы партыец) — за дрэнную якасьць і недысцыплінаванасьць — у газэту.

— Гольдбэрг, таб. № 26 — атрымаў вымову за дрэнную якасьць і сыстэматычнае спазьненьне на работу. За Гольдбэргам ідуць рабочыя Касторыум, Рубінштэйн і інш. Усё гэта ўдарнікі з мінусам.

Мы-б ня ўсё сказалі аб рабочых-швэйніках, калі-б не паказалі іх дасягненьняў у галіне вытворчых камун. Цяпер на фабрыцы налічваецца 7 камун. Яны яшчэ ня вывучаны, як належыць. Але факт, што камунары адыгралі вялікую ролю ў мабілізацыі ўвагі ўсяго калектыву для ліквідацыі студзеньскага прарыву. Вось на дошцы вытворчых паказальнікаў прымацавана цікавая справаздача аднэй з камун. Камуна складаецца з 10 чал. і пачала сваю працу ў лютым гэтага году. Справаздача дае параўнаньне паказальнікаў працы да стварэньня камуны і ў камуне. Падамо некалькі гэтых лічбаў, якія гавораць самі за сябе.

Колькасьць адпрацаваных гадзін у камуне ўзрасла да 851, замест ранейшых 731. Рост адпрацаваных апэрацый з 37.688 павысіўся да 58.276, або амаль на 20.000 апэрацый. У адпаведнасьці з гэтымі паказальнікамі вырасла і заработная плата камунараў, склаўшы 122 проц. ранейшай, а прыработак вырас да 26 проц. (да камуны толькі 3 проц.). Камунары дабіліся максымальнага скарачэньня нявыхаду на працу, а калі меліся вымушаныя нявыхады камунары спраўляліся з апэрацыяй калектыўна. Ня ўсе камуны маюць такія дасягненьні. Аднак, яны ўжо заваявалі на фабрыцы пэўны аўтарытэт. Дрэнна толькі, што да апошняга часу ім зусім недапушчальна мала зварачалася ўвагі з боку адміністрацыі.

Рабочы калектыў фабрыкі «Кастрычнік» сустракае баявое пралетарскае сьвята 1-га мая з не малымі посьпехамі і бадзёрым ударніцкім настроем. Прамфінплян з 1-га па 25-ае красавіка перавыкананы на 17 проц. Зьніжэньне сабекошту за паўгода па ўсім асартымэнце выканана на 12 проц. Сярэдняя зарплата рабочага складае 103-110 руб. Ударніцкі рух вярбуе ўсё новых і новых рабочых і неўзабаве ўся фабрыка стане ўдарнай. У будучым у яе самыя шырокія пэрспэктывы, аб чым мы пісалі спачатку. Таму калектыву швэйнікаў няма патрэбы захоўваць свае пасобныя хібы, якія ёсьць на сёнешні дзень. Сярод іх — зусім дрэнная пастаноўка справы рацыяналізацыі, скарыстаньня і пашырэньня рабочага вынаходніцтва. Цэлы рад каштоўных прапаноў па віне старой адміністрацыі застаюцца дагэтуль не разгледжанымі і нерэалізаванымі.

Бюро партыйнага калектыву цяпер сур'ёзна занялося гэтым пытаньнем. Так званыя пераробкі патрабавалі за паўгода 12.273 рабочых - гадзін, што роўна страце 10.533 руб. Значным застаецца і процант браку. Яшчэ ня ўсе камуністы і камсамольцы даюць узор дысцыпліны і сьвядомасьці на вытворчасьці. Гэта трэба асабліва падкрэсьліць, маючы на ўвазе пэрспэктывы фабрыкі.

Ёсьць у швэйнікаў і яшчэ хібы, якія ўжо ад іх не залежаць, але тым ня менш маюць уплыў на настроі рабочых. Папершае, гэта незабясьпечанасьць усіх рабочых гарачымі абедамі. Без абедаў застаюцца сотні рабочых. Нам думаецца, што ўсе швэйнікі - ўдарнікі маюць права на тое, каб есьці гарачыя абеды. І яшчэ адзін буйны недахват: калектыў у 1.700 чал дагэтуль ня мае свайго клюбу. Размах культурна - масавай работы на фабрыцы досыць вялікі. Ён параліжуецца адсутнасьцю памяшканьня для работы. А між тым хутка рабочы калектыў фабрыкі «Кастрычнік» больш, чым падвоіцца. Пра клюб швэйнікі гавораць у часе перапынкаў і на сходах.

Таму, я думаю, што правільна перадам іх думку, калі закончу нарыс такімі словамі:

Вялікі калектыў рабочых швэйнікаў фабрыкі «Кастрычнік» павінен мець вялікі, па росту, культурны клюб.

Р. К.

Новыя прадпрыемствы, новыя культурныя ўстановы

Першамайскія сьвяты ў БССР будуць адзначаны адкрыцьцем раду новых прамысловых прадпрыемстваў, культурна-бытавых устаноў,ф электрыфікацыяй фабрык і заводаў, выпускам ліпцунктаў.

У Крычаве (Магілеўская акруга) будзе пушчаны новы **фасфарытны завод.** Гэта першы па Беларусі буйны завод на выпрацоўцы фасфарытых мукі для ўгнаеньня палёў. Завод пераходзіць на тры зьмены. Уся работа яго мэханізавана. У 1930-31 годзе ён дасьць 42.000 тон фасфарытнай мукі.

У Менску адкрываецца **школа-фабрыка швэйнай прамысловасьці** на 29 чалавек. З 1-га кастрычніка лік вучняў павялічваецца да 500.

Беларуская кантора электра-тэхнічнага трэсту да 1-га мая канчае **мантаж машын для панчошна-трыкатажнай фабрыкі,** алейнага заводу і друкарні «Камінтэрн» у Віцебску. Гэтыя прадпрыемствы атрымаюць першы ток ад Асінбуду.

У Менску **скончана электрыфікацыя дражджавога заводу «Чырвоная Зорка»,** дзе ўстаноўлена некалькі матораў на 200 сіл.

Наркамат аховы здароўя адкрывае па Рэвалюцыйнай вул., **2 габінэты фізкультуры.** Задача габінэтаў — распрацоўка навукова-мэтадычных пытаньняў фізкультуры.

У Чарніцах, Віцебскай акругі, адкрываецца **новы павільен касьцяна-сухотнай дзіцячай санаторыі.**

Спажывецкая кааперацыя БССР **абсталявала ў адным з** сельсаветаў Сьмалявіцкага раёну, Менскай акругі, **трансляцыйны радыё-вузел,** які дае магчымасьць радыёфікаваць калгасы і сялянскія хаты.

Чыгуначнікі Менскага вузла адрамантавалі ў звыштэрміновы час дармовозам адзін паравоз і 5 таварных вагонаў.

М. К.

ПЕРШЫ У БССР ЗАВОД ПА ВЫПРАЦОЎЦЫ МАСТАЎ

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта)

У першых лічбах мая пачынае працаваць першы ў БССР завод па выпрацоўцы мастаўя. Зараз канчаецца мантаж машын новага заводу.

Вытворчая праграма заводу да канца стрычніка гэтага году—750 скур мастаўя ў суткі. З новага гаспадарчага году пускная здольнасьць новага заводу павялічыцца да 1.000 скур у суткі. Завод будзе працаваць выключна на беларускім сырцы.

Усяго на заводзе будзе працаваць 600 рабочых.

Дзьве зьмены па 7 гадзін кожная—такі распарадак работ на заводзе.

Магілеўскі завод мастаўя зьяўляецца першым у СССР заводам, які будзе працаваць па новым сока-барабанным мэтадзе, ужываючы свае бацькаўскія дуб'яцелі.

Новы мэтад павялічвае прадукцыйнасьць працы на 54 проц., значна зьмяншае сабекошт прадукцыі, скарачае цыкль вытворчага працэсу з 60 да 7 дзён.

Кошт пабудовы заводу разам з абсталяваньнем—3 млн. руб.

А. СЯНКЕВІЧ



Новы завод мастаўя ў Магілеве, які адкрываецца 1 мая